Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

ПЯТНІЦА
8 КАСТРЫЧНІКА 1932 г.
№ 223 (3602)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 1-69
Адказн. сакратара 4-78
Сакратароў . . . . .
Начкан рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і ліставоскамі.
Рукапісы не звяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
1 дакумэнту аб згубе 2 руб.

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ — ПЕРАДАВЫ: Сацыялістычнай жывёлагадоўлі кіжыўны кармавы рацыён.
А. ГАК: Банкруцтва аграрнай «Рэформы».
САВЕТЫ! УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ НА ФРОНЦЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК (1-ая стар.).
Груба парушаюць правы настаўніцтва Аршанскія «сунтэр-пошыбеевы». (2-ая стар.).
ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЛЕТАШНІЯ ПАМЫЛКІ. Тэхкультурам — неразрыўны ход з апрацовачных на загатоўчыя пункты (1-ая стар.).
З ФРОНТУ ЎБОРАЧНАЙ (2-ая стар.).
Ударнікі прамысловасьці адказваюць канкрэтнымі справамі (3-ія стар.).
Лісты калгасьнікаў, селькораў і шанікаў (3-яя стар.).
Шматтыражка «За ўдарны тэмпы» сёньня сьвяткуе выпуск сотага нумару газэты (3-яя стар.).
Энэргічней змагацца за права стаць на старт трэцяга конкурсу (4-ая стар.).
ЗА ГРАНІЦАЙ (4-ая стар.).

Сацыялістычнай жывёлагадоўлі-спажыўны кармавы рацыён

У агульным лянцугу мерапрыемстваў па фазьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі кармавая праблема займае цэнтральнае месца. Без стварэньня моцнага кармовага балянсу мы ня зможам утрымаць патрэбную колькасьць прадукцыі жывёлагадоўлі. Барацьба за кармы, гэта—па сутнасьці барацьба за рост пагалоўя, за павышэньне прадукцыйнасьці стада.

Вось чаму да пытаньня кармоў, да падрыхтоўкі пераводу жывёлы на зімовае ўтрыманьне павінна быць прыкавана ўвага мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый, усіх саўгасаў і калгасаў. Задача кожнай сацыялістычнай гаспадаркі стварыць на зіму такі кармавы баланс, які-б сапраўды забясьпечыў жывёлу ад бескормицы.

Але нам патрэбны ня ўсякі кармавы баланс—абы толькі набыць кармы—гэтага мала. Кармавы баланс, які пабудаваны выключна на саломе і дрэнным сене, такі баланс ня можа спрыяць заданьням разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Якасьць кармоў—вось галоўнае, што павінна быць пакладзена ў аснову кормаздабываньня. Кармавы рацыён нашых жывёлаў, а дойных калгасаў і саўгасаў яшчэ і па сёньняшні дзень зьяўляецца «галодным шаньёнам». У ім амаль няма сакавітых і канцэнтраваных кармоў. На самай справе, ці-ж можна чакаць павялічэньня прадукцыйнасьці стада, калі ў сярэднім на долю прубых кармоў (салома, сена) прыпадае 73,1 пр. сакавітых—25,4 проц. канцэнтратаў—1,5 проц.? Бязумоўна не.

Барацьба за паваліччэньне ўдзельнай вагі сакавітых кармоў пастаўлена на парадак дню.

Ці ёсьць у нас у наяўнасьці ўсе магчымасьці пасьпяхова вырашыць гэтую задачу?

Такія магчымасьці ў нас ёсьць. Пачэснае месца ў гэтай справе належыць сілаванню кармоў. Крыніцы сілоснай сыравіны ў БССР невычэрпальны. Пры належнай арганізацыі гэтай справы мы можам ня толькі выкарыстаць, але і перавыканаць праграму па сілосе. Для гэтага патрабуецца штодзённая клапатлівая работа на арганізацыі сілаваньня, рашучая барацьба з нетаварыскай гэтай справы.

Здавадася-б, што такое важнейшае мерапрыемства, як сілаваньне кармоў павінна было стаяць у цэнтры ўвагі партыйных і савецкіх арганізацый на мясцох. Між тым, у радзе зьвяньняў раённага і нават цэнтральнага апарату назіраецца яўнае ігнараваньне сілаваньня. Аб гэтым гавораць рад матар'ялаў з месц, урэшце, аб гэтым гавораць даныя аб ходзе сілаваньня на БССР. Зьвернемся да фактаў.

На 30 верасьня засілавана 301.021 тона ці 25,1 проц. На 25 верасьня было закладзена 260.805 тон, або 21,7 проц. пляну. Прырост ўсяго на 3,4 пр. Такі малюнак у цэлым па рэспубліцы. Яшчэ больш недапушчальнае ні на чым не абгрунтаванае адставаньне мы маем у раённым разрэзе. Возьмем групу адстаючых раёнаў. Бешанковіцкі раён, напрыклад, выканаў плян на 2,6 проц., Лоеўскі—на 5,9 проц., Лельчыцкі—7,4, Полапоўскі—7,5, Чырвонапольскі—7,8, Рэчыцкі 9,3 проц. і Глускі—на 9,8 проц.

Дзе прычыны? У чым карэніні недапушчальнага адставаньня барацьбы за сілос?

Прычыны прарыву—у апартуністычнай бязьдзейнасьці, якая праяўляецца з боку некаторых кіруючых работ нікаў саўгасаў і МТС, у адсутнасьці кантролю над выкананьнем пляну сілаваньня з боку райза і райкалгасаюзу. Урэшце, прычына ў адсутнасьці арганізацыйна-масавай работы сярод шырокіх мас працоўнага сялянства. Мы ўправе папрабаваць і патрабуем ад партарганізацый, саветаў і дэпутацкіх проц адстаючых раёнаў рашучага пералому ў работе, у бліжэйшую дэкаду накрыць запазычанасьць краіне па сілосе.

Прыклад раду саўгасаў, МТС, калгасаў і нават раёнаў, якія дамагліся ў апошнія дні рэзкага пералому, выразна паказвае, што ўвесь «сакрэт» пасьпяховай барацьбы за сілос у ініцыятыве і настойлівасьці, у бальшавіцкай арэрацыйнасьці, у канкрэтным кіраўніцтве.

Буйнейшыя посьпехі ў сілаваньні кармоў мае Аршанскі раён, які заклаў 22.765 тон, або 92,6 проц. пляну. Маюць зрух у сілаваньні кармоў таксама Мсьціслаўскі (54,1 проц.) і Клімавіцкі (52,8 проц.) раёны.

Прыклады бальшавіцкай барацьбы за сілос Аршанчыны даюць нам поўнае права патрабаваць ад адстаючых раёнаў забясьпячэньня выкананьня пляну сілаваньня ў бліжэйшую дэкаду.

У чым «сакрэт» Аршанчыны, якая з пяцідзёнкі ў пяцідзёнку дае прырост 15-20 проц.?

Прынаўшы выклік Сычоўскага раёну (Заходняя вобласьць) Аршанчыны паставіла задачай дамагчыся пачэснага званьня—ўзабіцца раёнам суцэльнага сілаваньня. У адказ на сацыялістычны рахунак сычаўцаў, саўгасы і калгасы Аршанчыны выступілі з баявым лёзунгам—«даць па тры тоны сілосу на кожную галаву жывёлы». Паход за рэалізацыю гэтага лёзунгу ўключыўся шырокія масы калгасьнікаў, рабочыя саўгасаў і МТС. Хваля сацыстаборніцтва і ўдарніцтва перакінулася з брыгады ў брыгаду, ад адной гаспадаркі ў другую. Масы мабілізаваны, масы пад кіраўніцтвам партарганізацыі рушыліся ў паход за сілос. У выніку, заданьне выкананага на 92,6 проц., раён сапраўды шчыльна падыйшоў да суцэльнага сілаваньня. Тэмпы і мэтады работы Аршанчыны павінны быць перанесены ва ўсе раёны БССР.

Сілаваньне кармоў прыкоўвае да сябе сур'ёзную ўвагу. Трэба не забываць, што кастрычнік—рашаючы месяц сілаваньня кармоў. З дню на дзень набліжаюцца халады, скарачэньне натуральных запасаў зялёнай масы. Пакуль ня поўна трэба нязвартаць упушчаны час. Для гэтага патрабуецца энэргічная мабілізацыя ўсіх сіл, патрабуецца ініцыятыўнасьць у рабоце.

Асабліва нецярпімы факты ігнараваньня сілосу, якія маюць месца з боку паасобных саўгасаў і МТС. Саўгасы і МТС могуць і павінны забясьпечыць пасьпяховае заканчэньне ходу сілаваньня кармоў па рэспубліцы.

У распарадкаваньні МТС ёсьць мэханічная сіла, якая нажаль, да гэтай пары не выкарыстоўвалася належным парадкам. Аб тым, як трэба выкарыстаць гэтую сілу, прыклады паказвае Даманавіцкая МТС. Умелае скарыстаньне практара і сілаарэзкі (круглаўстачная работа), плюс арганізацыйна-масавая работа—вось што дало магчымасьць Даманавіцкай МТС дабіцца посьпехаў у сілаваньні кармоў.

За сілаваньне кармоў дырэктары МТС нясуць адказнасьць побач з праўленьнямі калгасаў. Трэба весьці самую рашучую барацьбу з апартуністычна4 тэорыяй чарганьня кампаній. Задача саўгасаў, МТС і калгасаў—на хаду пераключаць пяту і людзей на збор і закладку сілосу, спалучаючы гэту работу з іншымі сельска-гаспадарчымі работамі.

Цэнтральнае месца ў справе сілаваньня кармоў павінна заняць жывёлагадоўчая брыгада. Жывёлагадоўчая брыгада ня можа ня быць зацікаўленай у вынніках сілаваньня, паколькі ад забясьпечаньня стада кармамі залежыць у канчатковым выніку посьпех іх работы, а значыцца і даход. Адсюль жывёлагадоўчая брыгада павінна быць уключана ў барацьбу за сілос, прымаць у гэтай справе самы актыўны ўдзел.

Надышоў самы адказны, самы рашаючы час сілаваньня.

Закладку сілосу трэба весьці ўдзеся цяжкымі тэмпамі. Цэнтр усёй работы партыйных ячэек і саветаў у разгортваньні сілаваньня павінен быць перанесены непасрэдна ў калгасы, на вытворчыя вучасткі МТС, у брыгады.

Трэба весьці самую рашучую барацьбу з кулацкімі правакацыямі проці пастаўленьня сена сілосу. Разважны ні аб тым, што пры наяўнасьці дастатковай колькасьці сена, непатрэбен сілос, гэтыя разважаньні выходзяць з кулацкага арсэналу. Кулак і яго агентура імкнуцца перашкодзіць, сарваць сілаваньне, падарваць кармавую базу.

Разгортваючы сацыялістычныя мэтады працы, партарганізацыі і саветы павінны забясьпечыць пасьпяховае заканчэньне барацьбы за сілос, да XV гадавіны Кастрычніка прыйсьці з партам перамог аб закладцы 1.200 тыс. тон спажыўных кармоў патрэбных для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Усім гаркомам, райкомам КП(б)Б

ЦК КП(б)Б прапануе забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне месячніка збору і вывазкі мэталалому з глыбінных пунктаў да 25 кастрычніка.

Сакратар ЦК КП(б)Б ІВАНОЎ.

13 кастрычніка ў будынку Яўрэйскага дзяржаўнага тэатру
(былы дом Культуры) а 6 гадзіне ўвечары
склікаецца
ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б
разам з членамі ЦК, ЦКК, ГарКК КП(б)Б, якія знаходзяцца ў Менску гарадзкім і гарнізонным партактывам.
ПАРАДАК ДНЮ
1. Даклад аб выніках верасеньскага пленуму ЦК УсеКП б і задачах партарганізацыі Беларусі дакл. т. ГІКАЛО
Члены і кандыдаты ЦК, Менгаркому, ЦКК і ГарКК КП(б)Б праходзяць па сваім мандатам.
Партактыў праходзіць па спэцыяльным прапускам, якія будуць выдавацца сакратаром партячэек 11, 12, 13 кастр. у гаркоме партыі (пакой 32) з 10-4 гадз. дню.
БЮРО МЕНГАРКОМУ

БАРАЦЬБА ЗА ЛЁН

Папярэдзіць леташнія памылкі

ТЭХКУЛЬТУРАМ — НЕРАЗРЫЎНЫ ХОД З АПРАЦОВАЧНЫХ НА ЗАГАТОЎЧЫЯ ПУНКТЫ

Аб ходзе апрацоўкі і загатоўкі лёну па БССР

Зводка НКЗБ на 30 верасьня (у проц.)

	Абмалочана	Раслана	Паднята	Загатоўлена лёнавалакна
На 30 IX 1932 г.	95	90,4	18,7	1,4
Было на 25 IX 32 г.	91,2	88,1	11,4	0,5

Ня гледзячы на тое, што прайшло больш месяца з таго часу як была закончана ўборка лёну, апрацоўка яго ганебна тармозіцца. Як відаць са зводкі НКЗБ, на 30 верасьня абмалочана толькі 95 проц. ураджаю, раслана 90,4 проц., паднята 18,7 проц.

Мы ўжо ня раз сыгналізавалі, што стварыўся вялікі разрыў паміж паасобнымі працэсамі першапачатковай апрацоўкі, але на сёньняшні дзень гэты разрыў не ліквідаваны. Недапушчальным зьяўляецца такое становішча, калі 5 проц. лёну засталося яшчэ неабмалочаным; не раслана поўнасьцю нават лёнасаломка абмалочанага лёну. У выніку апартуністычных адносін паасобных калгасаў і сельсаветаў да апрацоўкі лёну ёсьць пагроза што і сёлета можа застацца неапрацаваний як і ў мінулым годзе, вялікая колькасьць лёнасаломкі.

Чаго варта такая работа, калі па Буда-Кашалеўскім раёне ўраджай лёну абмалочаны толькі на 64,8 проц. Брагінскім—на 74,6 проц., Дубровенскім—78,7 проц., Дрысенскім—79,9 проц. проц. Гарадоцкім—87,1 проц.

Усе раённыя арганізацыі павінны з самага пачатку лёнаапрацовачнай кампаніі добра ўсьвядоміць, што на шы лёназаводы ня змогуць сёлета апрацаваць увесь ураджай лёну. Ручная апрацоўка яго будзе яшчэ ў гэтым годзе займаць рашаючае месца. Выходзячы з гэтага, трэба рашуча перабудаваць работу па пераапрацоўцы лёну.

Яўна нездавальняюча разгортваецца мяцьцё лёну і загатоўка валакна. У выніку недаацэнкі гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі з боку некаторых партыйных, савецкіх, зямельна-калгасных і загатоўчых арганізацый не разгарнуліся як сьлед лёназагатоўкі. Паводле пастановы партыі і ўраду, у III квартале 1932 г. павінна было быць загатоўлена ня меньш 5 проц. гадавога пляну лёнавалакна, у IV квартале—75 проц., у I квартале 1933 году—20 проц. Але даныя аб загатоўках за III квартал сыгналізуюць аб недапушчальных тэмпах работы. На 30 верасьня гадавы плян выкананы толькі на 1,4 проц., а верасеньскі плян—на 18,2 проц. Некаторыя лёнаводныя раёны амаль не прыступілі да загатоўкі лёну. Сіроцінскі раён, напрыклад, загатовіў толькі 1 цнтр. лёнавалакна, Лепельскі раён выканаў плян на 0,03 проц. Зусім не прыступілі да загатовак Дуброўенскі і Рассонскі раёны.

Паданыя тут лічбы сьведчаць аб тым, што ў нас ёсьць пэўны прарыў на фронце першапачатковай апрацоўкі лёну і загатоўкі яго. Гэты прарыў трэба неадкладна ліквідаваць. Усе раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі, райкалгассаюзы і сельсаветы павінны неадкладна паставіць у цэнтр увагі сваёй штодзённай работы барацьбу за лён. Да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі мы павінны прыйсьці з поўнымі перамогамі па апрацоўцы і загатоўцы лёнапрадукцыі.

Усе лёнаапрацоўчыя пункты, лёнамялкі павінны быць гатовы да работы і працаваць круглыя суткі. Неабходна з самага пачатку правільна расставіць сілы, забясьпечыць сушні апаламі і г. д.

Поруч з гэтым трэба шырока папулярызаваць сярод калгасных мас пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР «Пра загатоўку лёну і капапель ураджаю 1932 г.» і аб тых льготах, якія атрымаюць калгасы і калгасьнікі пры выкананьні загатовак у вызначаны тэрмін.

Лён патрабуе самай пільнай увагі з боку ўсіх арганізацый. Наша тэкстыльная прамысловасьць чакае сыравіны, гэтая сыравіны ёсьць. Мы можам і павінны яе даць.

10 га лёну стаіць нявыцераблёным

СУРАЖ. У калгасе імя Карла Маркса (Баталіцкі сельсавет) лён на плошчы 10 га стаіць яшчэ ня выцераблёным. Сураская МТС прывезла ў калгас лёнацерабілкі. Але для цераблёньня лёну трактара не дала. У выніку чаго стаіць церабілкі, стаіць на полі і лён.

Праўленьне калгасу, на чале з старшынёй Саўчанкам Сьцяпанам, да сканчэньня цераблёньня лёну ніякіх захадаў ня ўжываюць. Такая работа на руку кулаку, які сваёй жывёлай травіць калгасны лён і сенажаці.

Выцераблены лён таксама стаіць на полі ў раскіданым выглядзе. Па ім пасецца жывёла. Баталіцкі сельсавет са свайго боку таксама нічога ня робіць. Камсамольская ячэйка саўгасу стаіць у баку ад усіх гаспадарча-палітычных кампаній. Рабочая сіла ў калгасе скарыстоўваецца нерацыянальна, брыгады не замацаваны за паасобнымі аб'ектамі работы.

Калгас імя Карла Маркса плянуецца ў хвасьце і па выкананьні ўсіх відаў загатовак.

Сураскаму РВК РСІ і райпракурору неабходна заняцца разгляданнем гэтай справы і винаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

ЛУЧ.

За сваячасовы пад'ем і выгрузку ільнатрасты

Партыя і ўрад паставілі ўборку 1 апрацоўку тэхнічных культур, барацьбу са стратамі, павышэньне якасьці працы у бягучым годзе як галоўную гаспадарчую задачу. Гэта павінна даць павялічэньне ўраджайнасьці і паляпшэньне якасьці валакна і насеньня лёну.

Паколькі апрацоўка лёну складаецца з многіх працэсаў і расьцягнута па часе свайго выкананьня, вельмі лёгка дапусьціць тую альбо іншую памылку, што можа прывесьці да значных страт, асабліва ў тых сацыялістычных гаспадарках, дзе справа ідзе аб дзесятках і сотнях га тэхнічных культур. Вось чаму трэба добра ведаць тэхніку апрацоўкі лёну і канапель, каб не дапусьціць памылак, хібаў, страт, павялічэньня выхаду колькасьці і якасьці прадукцыі. Увесь час уборкі і апрацоўкі трэба быць напагатове.

У гэтым артыкуле мы спынімся на бягучых момантах апрацоўкі лёну.

Прымаючы пад увагу раньнюю ўборку ў гэтым годзе і ў сувязі з гэтым раньнюю расьсьцілку і замочку лёну —контрольныя тэрміны 20 верасьня —трэба сказаць, што ужо надышоў час да падбіраньня і выгрузкі трасты. Першым пытаньнем тут зьяўляецца пытаньне аб працяжнасьці ляжаньня і мачэньня і аб спосабах вызначэньня іх каканя.

Шматгадовымі досьледамі даведзена, што пры спрыяючых умовах лён вылежваецца праз 15-20 дзён, а адмочваецца праз 10-15 дзён. Хістаньні ад гэтых норм залежаць ад якасьці саломы, гушчыні расьсьцілу, якасьці сьцеліўча, мачыла і іншых умоў.

Тоўстая салома вылежваецца і вымочваецца хутчэй, чым тонкая пры роўным і тонкім расьсьціле хутчэй чым пры няроўным і тоўстым расьсьціле, даючы адначасова лепшую трасту і валакно. Вылежваньне на лузе, канюшынішчы і жніўі з падсевам канюшыны праходзіць хутчэй і дае лепшыя вынікі, чым вылежваньне на выгане з малою травою, на голым жніўі з высокаю стэрняю, на голым ільнішчы і нізкіх забалочаных мясцох. Дрэнныя вынікі дае мачэньне ў мачылах з вадою, у якой шмат вапны, жалеза (іржавая вада), або ў вадзе забруджанай папярэднімі мачэньнем. Адмочваньне будзе крыху зацяг вацца ў мачылах з крынічнаю вадою, тэмпэратура якой больш нізкая, чым у звычайных мачылах.

Умовы надвор'я 1932 г. па БССР трэба лічыць спрыяючымі для адмочваньня і вылежваньня трасты. Аднак працяжнасьць і канец вылежваньня і вымочваньня вызначаюцца наступнымі больш дэталёвымі момантамі.

Праз 10-15 дзён ад пачатку расьсьцілу трэба аглядаць сьцеліўча кожны дзень і сачыць за станам трасты. Салома, якая вылежалася, прымае цёмна-буры колер. Яна лёгка трэцца ў руках. Камель вылежваецца хутчэй, таму трэба прабаваць мяць і аглядаць каліва ў частцы ад галовак.

Канчатковае заключэньне пра тое, ці вылежалася каліўе, даецца толькі пасьля таго, як з розных месц сьцеліўча будзе ўзята каля 1 кілё яго, высушана (на пліце або на печцы), зьмята і вытрапана ў той-жа дзень (у крайнім выпадку на другі дзень). Калі кастрыца лёгка адстае ад валакна, дык каліўе вылежалася. Калі першая проба не дае добрых вынікаў, дык праз 2-4 дні, у залежнасьці ад надвор'я (пры цёплым і даждлівым надвор'і праз 2, пры халодным і сухім—праз 4 дні) пробы паўтараюцца. За час вылежваньня бярэцца ня менш 2-х проб.

Канец мачэньня вызначаецца па наступных адзнаках.

Сьцяблы робяцца сьлізкімі і ад іх пачынае лёгка адставаць валакно, «сьцяблы пазуценяцца». Сьцяблы ня гнуцца, а ломяцца з трэскам.

Зламаўшы сьцябло ў двух мясцох на адлегласьці адно ад аднаго на 15 сантымэтраў, можна лёгка выцягнуць выламаную кастрычыну, можна таксама пазнаць канец мочкі па такіх прыметах:

Калі лён гатовы—паложаная на ваду жменька мокрых сьцяблоў топіцца і ляжыць пад вадою. Калі ёсьць усе гэтыя адзнакі, тады пры мачэньні да канца трэба ўзяць прады, і зрабіць з імі як пры расьсьціле, і калі яны гатовы, вырашаць пытаньне аб гатовасьці ўсяе загружанае саломы.

Проба бярэцца абавязкова з сярэдзіны снапа і з некалькіх месц мачыла.

Пры мачэньні да канца, проба павінна паказваць поўную гатоўнасьць. Калі мачэньне вядзецца не да канца, а з далейшай далежкаю трасты на сьцеліўчы (так званы пскоўскі або зьмешаны спосаб мачэньня), тады як папярэднія адзнакі, таксама і проба—павінны паказваць недамочку.

Выгружаная і пасланая недамочаная салома ў далейшым падлягае тым правілам вызначэньня канца вылежваньня, як і чыста сланцовая салома.

Пры здыманьні са сьцеліўча трасту трэба сартаваць па ступені гатовасьці.

Тут можа зьявіцца пытаньне: навошта цяпер сартаваць, калі мы гэта рабілі перад расьсьцілам? Адно другога ня выключае. Перад расьсьцілам сартуецца салома, а пасьля расьсьцілу траста. Паколькі поле для расьсьцілу няроўнае, паколькі будуць пападацца няроўнасьці ў таўшчыні расьсьцілу, няроўнасьці пласта ад скручваньня саломы ветрам,—заўсёды будзе неадналкавая на якасьці траста, што вымагае снаповай (цэлымі снапамі) сартыроўкі пры пад'ёме трасты са сьцеліўча. Адсартыраваная, недалежаная і рыжая траста ня зьмешваецца з астатняю і апрацоўваецца асобна.

Паднятую трасту тут-жа на полі трэба ставіць у конусы для прасушваньня на сонцы. На конус бярэцца каля 1—1½ клгр. трасты. Пры сухім сонечным надвор'і траста ў конусах высыхае праз 1-3 дні пры ўмове вываручваньня конусаў на другі бок ад 1 да 3 разоў.

Высушаную ў конусах трасту вяжуць у снапы вагою да 4 клгр. Пры вязцы абавязкова пастукваньнем аб зямлю выпрастоўваюцца камлі.

Пры ўсякім надвор'і палявую сушку можна давесьці ня менш да 16-18 проц. вільготнасьці і тады без небясьпекі папсаваньня, яе можна складваць да часу апрацоўкі і здачы на завод.

Вось усе правілы тэхнікі падбіраньня і сушкі трасты, выкананьне якіх забясьпечвае барацьбу са стратамі і павялічвае выхад прадукцыі добрай якасьці.

Правіл нямнога і яны ня новыя. Але мы павінны іх кожны раз паўтараць і падкрэсьліваць, бо штогод на гэтых працэсах бывае многа страт. Асабліва часта траста падымаецца не далежалай (радзей пералежалай). Вельмі шмат у мінулым годзе падняялі калгасы мокрай трасты і, не прасушыўшы яе на полі, зьвязьлі мокрай на гумны. Яна замёрзла, для сушкі патрэбна было патрацiць шмат дроў і часу, сушка праходзіла пры ненармальна высокай тэмпэратуры і вільготнасьці, што выклікала значныя страты ў колькасьці (шмат блытаніны ад перакладваньня) і якасьці (было запарваньне, перасушка і няроўнае высыханьне ўсёй масы трасты, а потым дрэннае праміваньне, прапаранье зьнижэньне нумарнасьці і цаны).

Усім калгасам трэба добра ўзброіцца зараз перад чарговымі задачамі ў апрацоўцы лёну ня толькі тэхнічнымі ведамі, але і клясавай пільнасьцю, бо тут магчымы вылазкі клясавага ворагу, які будзе старацца на кожным кроку сарваць работу і не дапусьціць да правільнага і поўнага скарыстаньня ўсяго ўраджаю тэхкультур.

Тут будуць казаць, што лён яшчэ пасьпее, што трэба сьпярша малаціць збожжа, выбіраць бульбу і г. д. Усё трэба рабіць, цесна спалучаючы іншую сельскагаспадарчую работу з апрацоўкай лёну, бо час апрацоўкі зьяўляецца канчатковым і рашаючым. Пропусьціш дзень—згубіш працу ўсяго гаспадарчага году, згубіш ўвесь ураджай.

Барацьба за лён павінна быць скончана пасьпяховай апрацоўкай яго, так сама як пасьпяхова праведзена сяўба і ўборка.

А. Шатэрнік.

Пад'ём трасты са сьцеліўч. (к-с «Но вы Шлях». Лезынен. раён).

100 проц. гадавога пляну збожжазагатовак да XV гадавіны Кастрычніка

САВЕТЫ! Узмацніць барацьбу на фронце збожжазагатовак

Узмацніць барацьбу за збожжа

Ад пасьпяховай работы кожнай партыйнай ячэйкі, кожнага сельсавету залежыць тэрміновае выкананьне пляну збожжазагатовак. Ад сельсавету і яго кожнага членаў па асобку патрабуецца асабліва чоткая работа, штодзённае практычнае кіраўніцтва збожжазагатоўкамі і разгортваньне масавай работы сярод працоўных аднаасобнікаў.

Аднак слабае разгортваньне збожжазагатовак па бальшасьці раёнаў БССР гаворыць аб тым, што сельсаветы яшчэ не разгарнулі належнай работы. Гэта яшчэ цалкам і поўнасьцю сьцьвярджаецца ганебным адставаньнем ў збожжазагатоўках аднаасобнага сэктару. Між тым у сваёй пастанове аб правядзеньні збожжазагатовак ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б яскрава гаворыць:

— «Пленум папярэджвае партыйныя арганізацыі супроць недаацэнкі аднаасобнага сэктару ў выкананьні пляну збожжазагатовак, абавязвае партарганізацыі весьці рашучую барацьбу з перагібамі і адміністраваньнем і дабіцца таго, каб аднаасобныя гаспадаркі здавалі збожжа дзяржаве з кожнага гэктару пасеву ня менш чым суседнія калгасы».

Такім чынам Пленум з ўсёй рашучасьцю падкрэсьліў ролю аднаасобнага сэктару ў сэнсе выкананьня гадавога пляну збожжазагатовак. Аднак паасобныя сельсаветы гэтаму пытаньню аддаюць вельмі мала ўвагі. Камісіі садзейнасьці, якія існуюць пры кожным сельсавеце, часам бязьдзейнічаюць, замест арганізатарскай ролі ў пытаньні збожжазагатовак. Разам з партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі яны павінны павесьці сапраўды бальшавіцкую барацьбу за збожжа, шляхам разгортваньня масавай работы, арганізацыі чырвоных абозаў са збожжам, разгортваньнем сацыялістычных мэтадаў работы ў збожжазагатоўчай кампаніі.

Вакол кожнага сельсавету павінен быць арганізаваны моцны калгасны актыў, з рабочых саўгасаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, якія-б павялі рашучую барацьбу з кулацкай агэнтурай. Гэты актыў павінен устанавіць сталы кантроль за работай райкантор «Загатзерня», з пункту погляду культурна-бытавога абслугоўваньня здатчыкаў збожжа. Ад таго наколькі канкрэтна, наколькі апэрацыйна будзе працаваць гэты актыў у вялікай ступені залежыць і пасьпяховае выкананьне збожжазагатовак.

ЗВОДКА
аб ходзе збожжазагатовак па БССР
па становішчы на 5-е кастрычніка (у тонах і проц.)

	У тонах	Процант выкан.
Калгасы МТС	4928	62,4
Іншыя калгасы	8581	48,5
Кантрактанты	3208	
Некантрактанты	5448	24,5
Цьвёрдыя заданьні	2101	
Насенлавыка	430	2,8
Пазбор	1208	20,1
Разам па БССР	24266	35,3

Збожжазагатоўкі ў Бобрскім сельсавеце ідуць самацёкам

Збожжазагатоўкі па Бобрскім сельсавеце і месцачковым савеце пупчаны на самацёк, а таму гэтыя саветы, апынуліся ў глыбокім прарыве. Аб гэтым могуць сьведчыць наступныя лічбы. Бобрскі сельсавет атрымаў заданьне па збожжы ў колькасьці 18 тон. Плян супроць мінулага году зьмешаны на палову. Але на 20-е верасьня 1932 г. кулацка-заможныя гаспадаркі здалі замест 6 тон толькі 42 пуды, аднаасобнікі, беднякі і сераднякі, здалі вельмі малую лічбу, калгасы здалі крыху больш—1326 клг.

Ня лепш з гэтаю справаю і па мястэчку Бобр. На м. Бобр прыпадае паводле пляну здаць 5 тон збожжа: цьвёрдазаданьнікамі 240 клг., аднаасобнікамі ,беднякамі і сераднякамі 340 клг. Чамусьці ў гэтых двух саветах панує думка, што «пляны надта малыя, а няварта турбавацца».

Сябры м. савету і сельсавету ўсім бязьдзейнічаюць. Яны першыя самі не здаюць збожжа.

РК КП(б)Б, РВК і партячэйка павінна прымусіць Бобрскі сельсавет і месцачковы савет выканаць плян збожжазагатовак у найкарацейшы тэрмін.

«Асьветы».

Працаваць мэтадамі Бортнікоўскага і Мышкаўскага сельсаветаў

(Ад нашага Бабруйскага корэспадэнта)

Бабруйшчына ня выканала пастаўленых перад ёю задач тав. Чарвяковым у час яго прабываньня ў раёне. На 1-га кастрычніка раённы плян збожжазагатовак выкананы толькі на 32,6 проц.—замест 50. Апошняя пяцідзёнка дала прырост у выкананьні пляну збожжазагатовак толькі на 7 проц.

З 28 сельсаветаў толькі невялікая колькасьць іх, дзякуючы разгортваньню шырокай растлумачальнай работы і рашучаму націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, дамагліся выкананьня 50 проц. пляну збожжазагатовак да 1-га кастрычніка. Да такіх належаць БОРТНІКАЎСКІ і МЫШКАЎСКІ. Першы з іх выканаў плян на 56,7 проц., а другі—на 50 проц. Есьць рад сельсаветаў, як, напрыклад, ВАРАТЫНСКІ, МІХАЛЕЎСКІ, СТАРЦОЎСКІ, якія набліжаюцца да выкананьня паловы гадавога пляну, даўшы на 1-га кастрычніка звыш 40 проц. пляну.

У барацьбе за выкананьне пляну збожжазагатовак надзвычайна паказальнай зьяўляецца работа БОРТНІКАЎСКАГА і МЫШКАЎСКАГА сельсаветаў. Гэтыя сельсаветы шляхам разгортваньня шырокай растлумачальнай работы сярод аднаасобнага працоўнага селянства дамагліся значных посьпехаў. Так, па БОРТНІКАЎСКІМ сельсавеце плян збожжазагатовак па аднаасобным сэктары выкананы на 60 проц. і па Мышкаўскім—на 50 проц. Падобнага процанту выкананьня пляну па аднаасобным сэктары ня мае ніводзін сельсавет раёну. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што там, дзе шырока разгорнута арганізацыйная работа вакол загатовак,—там выкананьне пляну збожжазагатовак ідзе пасьпяхова. Гэтыя сельсаветы арганізавалі рад чырвоных абозаў, у якіх актыўны ўдзел прымалі аднаасобнікі. Чырвоным абозам 25 верасьня Мышкаўскі сельсавет даставіў за адзін дзень 18 проц. агульна-сельсавецкага пляну. 2-га кастрычніка гэты сельсавет таксама актыўна ўдзельнічаў у агульна-раённым чырвоным абозе, арганізаваным у гонар прызыву ў Чырвоную армію прызыўнікоў 1910 году нараджэньня.

Вопыт перадавых Бортнікаўскага і Мышкаўскага сельсаветаў павінен быць пераняты ўсімі сельсаветамі раёну ў іх барацьбе за выкананьне пляну збожжазагатовак. Узмацненьнем арганізацыйнай і масавай работы, націскам на кулацка-заможныя гаспадаркі забясьпечым выкананьне гадавога пляну да XV гадавіны Кастрычніка.

А. ДАМБРОЎСКІ.

З бясьпечыць правы дзеяньне ў жыцьцё закону аб устойлівым землякарыстаньні

Партыяй і ўрадам за апошні час выдадзены цэлы рад гістарычных пастаноў, накіраваных да пасьпяховага завяршэньня сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Да ліку гістарычных пастаноў адносіцца таксама пастанова ЦВК і Саўнаркому СССР «Аб стварэньні устойлівага землякарыстаньня калгасаў». Гэтая пастанова замацоўвае тыя карэнныя зьмены, якія адбыліся за перыяд сацыяльнай калектывізацыі ў сельскай гаспадарцы.

У даны момант калгасы зьяўляюцца пераважнай формай землякарыстаньня. Новы закон замацоўвае за кожным калгасам зямлю, якая зьяўляецца на асноўным сродкам вытворчасьці. Гэты закон у асноўным накіраваны на стварэньне устойлівага землякарыстаньня.

Закон дае магчымасьць калгасам у шырокім маштабе правесьці агратэхнічныя мерапрыемствы, палепшыць тэй ці іншы вучастак зямлі, устанавіць сезаварот, унесьці ўгнаеньні і г. д. Ён зьявіцца апорай калгаснага сялянства у яго барацьбе з клясавымі ворагамі, якія імкнуцца затармазіць і паслабіць калгасны рух, апорай барацьбы за пабудову высокамэханізаванай калгаснай гаспадаркі, палепшаньня матэр'яльных і бытавых умоў калгаснікаў.

Закон патрабуе спыніць парушэньні працоўнага землякарыстаньня калгасаў. А такіх парушэньняў і скажэньняў у практыцы калгаснага будаўніцтва было даволі многа.

Па статуту с.-г. арцелі ўсе межы, якія падзяляюць зямельныя надзелы членаў арцелі, зьнішчаюцца, усе палявыя надзелы зьліваюцца ў адзіны масіў, што знаходзіцца ў калектыўным карыстаньні арцелі, які ні ў якім разе не павінен зьмяншацца. Надзяленьне выбыўшых членаў арцелі зямлёй павінна вытварацца за кошт зямельнай плошчы дзяржфонду.

Наркамзем СССР таксама неаднаразова ўказваў мясцовым зяморгранам, што ўвод новых зямель павінен ўтварацца не за кошт зямель асобных МТС і калгасамі.

Тым ня менш на мясцох знайшліся галавацяпы і апартуністы, якія парушалі землякарыстаньне калгасаў.

У некаторых раёнах паўтараліся частыя перадзелы зямельных вучасткаў. Гэта прывяло да запушчэньня вучасткаў, да скарочаньня пасеваў канюшыны і інш. шматгадовых культур, а таксама да скарачэньня плошчы засеву і памяншэньню ўраджайнасьці лёну.

Напрыклад у Беражанскай с.-г. арцелі зямлю, належачую калгаснікам, некалькі раз пераразалі і адразалі ў карысьць аднаасобнікаў. У выніку у калгаснікаў ня было зацікаўленасьці палепшаць зямельныя вучасткі.

У калгасе «Пражэктар» неаднаразова адрэзаліся належачыя ім вучасткі зямлі. Ва ўсіх гэтых калгасах не зварачалася ўвагі на якасную апрацоўку зямлі, таму што калгаснікі ня былі ўпэўнены, што ад іх не адбяруць той ці іншы зямельны вучастак.

Новы закон ужо даў станоўчыя вынікі. Калгасныя масы сустракаюць яго з аяліким энтузіязмам і прымаюць меры да выкананьня. Будучы цьвёрда ўпэўнены, што межы калгаснага землякарыстаньня ніхто не парушыць, калгаснікі завяраюць партыю і ўрад правесьці самую рашучую барацьбу з пуставэрствам, за лепшую апрацоўку зямлі, за высокі ўраджай палёў.

Шматлікія водгукі калгаснікаў сьведчаць аб тым, што пастанова ўрада аб устойлівым землякарыстаньні калгасаў зьявіцца моцным рычагом у барацьбе за высокі ўраджай.

Задачай усіх партыйных, савецкіх зямельных органаў, МТС і калгасных арганізацый у даны момант зьяўляецца арганізацыя шырокай кампаніі па растлумачэньні калгасным масам аб новым законе. Усе МТС, калгасы і асобныя калгаснікі павінны ведаць закон аб стварэньні ўстойлівага землякарыстаньня калгасаў.

Толькі ўсебаковае азнаямленьне з новым законам можа адхіліць усе тыя ненармальнасьці ў землякарыстаньні, якія назіраліся ў асобных раёнах і калгасах.

Задача ўсіх партыйных арганізацый, сельсаветаў і райзямаддзелаў заключаецца зараз у тым, каб на аснове гэтай пастановы ўраду яшчэ шырэй раз разгарнуць барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Айзман.

Гульню ў перадзелы яшчэ ня спынілі

(Ад нашага спэц. карэспандэнта).

БРАГІН. Рэалізацыя ўрадавай пастановы аб устойлівым землякарыстаньні калгасаў у Брагінскім раёне яшчэ ня стала сапраўдным сродкам замацаваньня існуючых калгасных межаў, стымулам для ўкладаньня ў глебу новых ўгнаеньняў і павышэньня ўраджайнасьці. Замест таго, каб замацаваць за калгасамі землі, карыстань не якіх было замацавана за імі раней, у раёне распачаўся масавы перамер пасеўных плошчаў. Бачыце, у раёне пасьпяшаліся скарыстаць пастанову для перамеру зямлёў і для ўстанаўленьня новых межаў.

Адвод калгасных зямляў пад саўгасы, пад аднаасобныя гаспадаркі і рад іншых моментаў перамеру зямлі, без уодзякай патрэбы—вось што зараз нагляднаецца ў раёне.

Так, саўгасу «Астраглядны», адведзена каля 40 гектараў зямлі, якая знаходзілася ў карыстаньні калгасу імя Варашылава. Гэты адмер праведзен бяз ўсякага ўзгадненьня з калгасным сходам, па волі «катосьці з раёну» і даным выпадкам не зацікавілася зямельная камісія.

Ад зямляў калгасу, што знаходзіцца ў в. Вязок, адведзена некалькі гектараў для перамеру іх паміж аднаасобнымі гаспадаркамі той-жа вёскі. І ў гэты-ж час у вёсцы меўся запасны фонд, які трэба было адвесьці аднаасобным гаспадаркам.

У в. Дубліч калгас зрабіў самавольны захоп сенажацяй, якія былі адведзены аднаасобным гаспадаркам. І ўсе гэтыя выпадкі, выпадкі проста га і бесспакаранага парушэньня ўрадавых пастаноў аб устойлівым землякарыстаньні калгасаў, праходзяць паза ўвагай арганізацый раёну і ў прыватнасьці зямельнай камісіі.

Зямельная камісія зьдзіўлена.

— Што-ж нам рабіць?—пытаюцца аднаасобныя працаўнікі яе.—Мы не атрымалі адпаведных дырэктыў з цэнтру.

А ў гэты-ж час на яе вялося права дзіцца адмер калгасных зямляў байгасам і аднаасобным гаспадаркам.

Праўда, у некаторых мясцох неабходны перамер зямляў для ўстанаўленьня канфігурацыі, спрыяючай зем лекарыстаньню таго або іншага калгасу. Гэткая канфігурацыя, напрыклад, патрэбна калгасам Гарадзішчанскага і Сялецкага сельсаветаў. Але і тут яшчэ ня выраішаны ўзаемаадносіны паміж калгасамі, аплата за ўкладзенае ўгнаеньне 1 г. д.

Зямельная камісія, не павінна спакойна глядзець на ўсе гэтыя зьявішчы—простыя выпадкі парушэньня ўрадавай пастановы. Зямельная камісія і ўсе іншыя арганізацыі раёну павінны павесьці рашучую барацьбу супроць парушэньня межаў калгасных зямляў. Неабходны перамер зямлі паміж калгасамі для ўстанаўленьня правільнай канфігурацыі павінен залежыць не ад настрою каморнікаў, а ад рашэньня агульных калгасных сходаў і ад рашэньня цэнтральнай зямельнай камісіі.

Вяч. П.

Гародніну—пралетарскім цэнтрам

Рэдакцыі „Савецкая Беларусь“ ЦК саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю

Нарада старшынь сельспажтаварыстваў і старшынь кантрольна-рэвізійных камісій Кармянішчыны пры падагульненьні ходу праверкі работы сельспажтаварыстваў абвясьціла сябе ўдарнаю па арганізацыі для рабочых Масквы чырвонага эшалёну гародніны ня менш як з 5 вагонаў і выклікала на соцспаборніцтва Чачэрскі раён.

Груба парушаюць правы настаўніцтва аршанскія „унтэр-прышыбеевы“

Гістарычныя пастановы ЦК УсеКП(б) ад 5-га верасьня 1931 г. і 25 жніўня 1932 г. аб пачатковай і сярэдняй школе выразна вызначаюць месца савецкага настаўніка ў справе падрыхтоўкі падрастаючага пакаленьня. Гэтыя пастановы зьяўляюцца лепшым доказам, таго, як партыя бальшавікоў няўхільна ажыцьцяўляе ленінскі завет аб народным настаўніку, паказвае канкрэтныя шляхі да стварэньня неабходных умоў для савецкага настаўніцтва, для выкананьня ад казных і пачэсных абавязкаў па навучаньні і выхаваньні пакаленьня, якое здольна пабудаваць камунізм.

Што пакладзена ў аснову работы з савецкім настаўніцтвам? Як мы павінны да яго адносіцца?

На гэтае пытаньне мы маем канкрэтны адказ Ленінскай партыі: **«у рабоце сярод настаўнікаў трэба кіравацца паказаньнем, даным Леніным яшчэ ў 1922 годзе: народны настаўнік павінен стаяць у нас на такой вышыні, на якой ён ніколі не стаяў, не стаіць і ня можа стаяць у буржуазным грамадзтве»** (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 5 верасьня 1931 г.).

Ня выконваць такой чоткай і яскравай дырэктывы партыі можа толькі той, хто не жадае лічыцца з партыяй, хто не жадае наогул выконваць яе дырэктыў.

Між тым «кое-хто» ухітраецца, прыкрываючыся паасобнымі фармальнасьцямі, зусім сьядома праводзіць антыленінскую лінію ў адносінах да настаўніцтва. Аб гэтым гаворыць нам тыя факты, якія назіраліся ў Аршанскім раёне зьняцьцем з работы настаўнікаў Скалавай і Мінянкова.

Тав. Забелін, загадчык Аршанскага райана на запытаньне аб прычынах зьняцьця з работы гэтых 2-х настаўнікаў адказвае надзвычайна проста:

«Скалава зьнята з прычыны няпрыгоднасьці быць настаўніцай, а Мінянкоў зьняты таму, што ня мае адпаведнай кваліфікацыі для работы ва ўзорнай школе».

Толькі той, хто не знаёмы з гэтай справай можа згадзіцца з такімі «прычынамі». Зусім зразумела, што няпрыгодным настаўнікам не павінна быць месца ў нашай школе.

Для таго, каб расшыфраваць гэтую «няпрыгоднасьць» застановімся караценька на характарыстыцы Скалавай і Мінянкова:

Т. Скалава скончыла Ленінградзкі інстытут яшчэ ў старыя часы, (цяпер рэарганізаваны ў інстытут Гэрцена), больш 20 год працуе на пэдагагічнай рабоце, актыўна ўдзельнічае ў грамадзкай працы, доўгі час была выдзеленым прафработнікам у школе. Камсамольская ячэйка дала ёй добрую характарыстыку па рабоце з піанэрскай арганізацыяй і вучнёўскім самакіраваньнем. Яна актыўна ўдзельнічае ў ліквідацыі няпісьменнасьці, калектывам 4-ай Аршанскай сямігодкі прэм'явана 1 мая 1932 г., як лепшая ўдарніца.

Аб тым, што становіць сабой настаўніца Скалава ў мінулым, гаворыць характарыстыка, дадзеная ёй членам партыі Ул. Забражнёвым (працуе ў Інстытуце Леніна пры ЦК УсеКП(б). У гэтай характарыстыцы чытаем: **«... увесну 1898 году тав. Скалава Вольга Акінфіеўна была арыштавана і прыцягнута да жандарскага дазнаньня аб арганізацыі групы асоб для перавозкі нелегальнай літаратуры ў Заходнім краі і ахове нелегальнай літаратуры. Пасьля 8 ці 9 месяцаў зьняволеньня ў доме папярэдняга заключэньня тав. Скалава была выслана пад галосны нагляд паліцыі на бацькаўшчыну ў Бабруйскі павет, Менскай губ.. Па скончэньні сьледзтва, галосны нагляд з абмежаваньнем месца жыхарства быў працягнут яшчэ на 3 гады, за час якога тав. Скалава пад верглася раду паліцэйскіх пакараньняў і была пазбаўлена права займацца пэдагагічнай дзейнасьцю».**

І вось Скалава, прэміяваная калектывам школы, як лепшая настаўніца-ударніца, прыкладна праз 11½ м-цы на раённай настаўніцкай канфэрэнцыі пачула грозны прыгавор загадчыка райана т. Забеліна: **«зьнята з работы настаўніца Скалава. Перавесьці на другую работу».** Прычыны? Аб іх спачатку і сам Забелін ня ведаў, а пасьля знайшоўся адказ: **«ня ўмеесце арганізаваць вучняў».**

Беспадстаўнасьць гэтага адказу відаць з таго, што за адказам настаўніца была накіравана да загадчыка школы т. Канцавога.

Апошні, як гэта відаць з ліста (Скалавай ў аршанскую газэту «Ленінскі прызыў» ад 23-VIII), знайшоў надзвычайна **«разумную»** прычыну: **«што я за няшчасны, што павінен працаваць усё са старымі».**—Так фармулюе прычыну звальненьня т. Скалавай загадчык школы Канцавы,

Але Канцавы праявіў клапатлівую **«літасьць»** да Скалавай і **«параў»** ёй падаць заяву аб звальненьні, каб у працоўным сьпісу ня было адзначана, што яна зьнята па загаду. Скалава, каб не ачарняць свой працоўны сьпіс, **«згаджаецца»**, піша заяву, пасьля чаго (на другі дзень) атрымоўвае працоўны сьпіс з адзнакай загадчыка школы Канцавога: **«Зволена з работы па ўласным жаданьні».** Такім чынам справа была зроблена, зволілі на стаўніцу - ўдарніцу з 20-ці гадовым стажам, шукаючы «матывы» для падцьверджаньня правільнасьці зьняцьця.

Скалава падае скаргу ў суд, які слухае гэту справу 10-IX—32 г. Але суд чамусьці ня мог адразу «разабрацца» ва ўсёй гэтай справе, разгляд справы адкладаецца і пераносіцца на разгляд камісіі «па пытаньні прыгоднасьці Скалавай да працы ў школе».

Экспэртыза не адбылася таму, што т. Скалава ад яе на зусім законных падставах адмовілася, пасьля чаго суд (19-20 верасьня) у другі раз разглядзеўшы справу, прызнае зьняцьце Скалавай правільным.

Такім чынам беспадстаўныя дзеяньні Канцавога і Забеліна ўзаконьваюцца Аршанскім судом.

Настаўнік Мінянкоў «зьняты з працы ў сувязі з тым, што ён ня мае адпаведнай кваліфікацыі для работы ва ўзорнай школе»—такі адказ дае тойжа загадчык АНА т. **Забелін.**

Т. Мінянкоў скончыў 1-га лютага г.г. пэдагагічны тэхнікум, вылучан для работы ў Белдрэсаўскай ФЗС.

Рад асьветнікаў: Мацаральнік, Потэц, Сяркоў (загадчык школы), Міхельсон адзначылі, што з працай па сваіх дысцыплінах Мінянкоў справіўся, добрасумленна адносіўся да распрацоўкі матар'ялаў у клясах, працуе па пляне, пасьпяховасьць яго вучняў добрая. Ударнік, удзельнічае ў грамадзкай працы, т. Мінянкоў вызначан для прэміяваньня на агульным сходзе асьветнікаў сталінскага мясцкому.

«Прэміраваць тав. Мінякова, як лепшага ўдарніка месяцам у адпачынчнай базе ў Ялце коштам у 150 р.» (З пратаколу паседжаньня Аршанскага райкому саюзу працасьветы ад 26-VI—32 г.). Пастанова зацьверджана настаўніцкай раённай канфэрэнцыяй.

У мэтах лепшай падрыхтоўкі да работы ў II канцэнтру тав. Мінянкоў рас паражэньнем АНА накіроўваецца на месячныя курсы падвышэньня кваліфікацыі, арганізаваныя НКА пры Віцебскім Індустрыяльна-Пэдагагічным інстытуце, якія тав. Мінькоў і скончыў.

Але... Мінянкову ўжо больш не шанцуе папасьці ў Белдрэсаўскую ФЗС. 26-га жніўня на яго месца прыяжджае новая настаўніца.

Мінькоў нават ня мог запытаць прычыны такога «сюрпрызу» пасьля прэміяваньня, курсаў і г. д., бо ён у гэты час, як камандзір пераменнага складу знаходзіўся на зборы—падвышаў сваю кваліфікацыю ў справе абароны краіны саветаў. Мала зьняць Мінянкова, трэба яшчэ пазьдзекваваць над ім. Па загаду загадчыка школы Сяркова арганізоўваецца высьленьне Мінянкова з яго кватэры. Па спэцыяльным заказе была зроблена адмычка, і «камісія» на чале з Януцам (на вялікі жаль старшыня селькому саюзу працасьветы) узброіўшыся гэтай адмычкай «заваёўвае» кватэру. У кватэру Мінянкова ўселілі ўноў прызначаную настаўніцу.

На нарадзе калектыву Белдрэсаўскай ФЗС, якая была праведзена 26 верасьня высьвятлілася, што Мінянкоў за час сваёй работы ў школе многа раз выступаў з крытыкай Сяркова, як загадчыка школы і настаўніка. Ён выступіў з адводам кандыдатуры Сяркова пры вылучэньні ўдарнікаў на прэміраваньне.

Калектыў настаўнікаў школы лічыць зьняцьце Мінянкова няправільным.

А як глядзяць на гэта аршанскія арганізацыі? Інспэктар працы прапанаваў АНА аднавіць Мінянкова на работе ў школе, РайКК-РСІ таксама прапануе аднавіць. Але для Забеліна і Сяркова прапановы гэтых арганізацый зьяўляюцца неаўтарытэтнымі—яны Мінянкова да работы не дапускаюць.

Што-ж робіць Аршанскі суд, куды перадаецца гэтая справа? Суд сваёй пастановай ад 26 верасьня прызнаў зьняцьце Мінянкова правільным.

Настаўніца Скалава і Мінянкоў абскардзілі гэтыя рашэньні Аршанскага суду ў Вярхоўны суд БССР.

Гэтыя справы заслугоўваюць увагі Аршанскага райкому партыі і патрабуюць ўмяшаньня цэнтральных арганізацый.

Аршанскі райпракурор, якому ЦП саюзу працасьветы накіравала гэтыя справы, павінен тэрмінова сказаць сваё слова.

Прыведзеныя факты сьведчаць аб тым, што ў Воршы мае месца яўнае скажэньне дырэктыў партыі аб настаўніцтве. Аршанскі нарсуд у даным выпадку стаў на шлях прыкрыцьця незаконных дзеяньняў асобных бюракратаў з апарату РайАНА і загадчыкаў паказаных школ. Такія рашэньні суду паказваюць на дрэнную барацьбу са скажальнікамі пастаноў партыі і ўраду аб асьветніках, на няўменьне змагацца за рэвалюцыйную законнасьць, за сапраўдныя ленінскія адносіны да настаўніцтва.

Пракуратура Рэспублікі, Вярхоўны суд і ЦКК НК-РСІ БССР павінны прыцягнуць да суровай адказнасьці аршанскіх «унтэр-прышыбеевых», каб на гэтых канкрэтных прыкладах навучыць арганізацыі, як трэба па баль павіцку змагацца за рэалізацыю дырэктыў партыі аб ленінскіх адносінах да настаўніцтва.

Н. Левін.



3-я домна Касагорскага мэталюргічна га заводу (Тула). Домна № 3 будзе даваць 400 тон чыгуну за суткі, альбо столькі колькі зараз даюць першая і другая домны разам.

Чырвоны абоз з бульбай (калгас «Но вы Шлях», Лёзьненскага раёну).

З фронту уборачнай

▲ **СЛУЦАК.** Калгас «Чырвоны Клешаў», Мусіцкага сельсавету, ідзе ў першаў, радавых радох па выкананьні ўсіх гасподарча-палітычных кампаній. Вакол пытаньня своячасовай ўборкі бульбы была мабілізавана ўвага калгаснікаў. Вытворчыя заданьні былі абгавораны на агульным сходзе і даведзены да кожнай брыгады і калгасніка. Паміж брыгадамі разгорнута сацспаборніцтва на хутчэйшае правядзеньне ўборкі. У выніку гэтага, уборка бульбы на бліжаецца да завяршэньня. Адначасова з правядзеньнем уборкі бульбы з карчоў, арганізавана перавораньне бульбянішча. Калгаснікі пастанавілі—не пакінуць у зямлі ніводнай бульбіны.

Калгас таксама добра спраўляецца і з іншымі сельска-гаспадарчымі работамі. Сяўба азімых была закончана ў палове верасьня са значным перавыкананьнем пляну. Замест вызначаных, паводле пляну 150 га, засеяна 175 га. Плян збожжа і бульбазагатовак выкананы да тэрміну, сельска-гаспадарчы падатак і страхоўка ўнесены на 100 проц. Падпіска на пазыку «Чацьвёрты заключны» рэалізавана ў калгасе на 1000 руб.

Гэтых посьпехаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгас «Чырвоны Клешаў» дамогся ў выніку правільнага кіраўніцтва парт'ячэйкі, правільнай расстаноўкі сіл, належнай работы па арганізацыі сталых вытворчых брыгад.

Усе калгасы раёну павінны раўняцца па калгасе «Чырвоны Клешаў».

Л. Хацкін.

▲ **КЛІМАВІЧЫ.** Калгас «Бронь», Малашкавіцкага сельсавету, закончыў уборку бульбы (287 га) і ў парадку загатовак здаў (прадаў) 12 тон дзяржаве. Гэтых посьпехаў калгас «Бронь» дабіўся у выніку разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, правільнай расстаноўкі рабочай сілы і замагаданьня да кожнай брыгады сталых аб'ектаў работы. Не малую ролю адыгралі партыйная і камсамольская ячэйкі, якія ўзьнялі авангардную ролю камуністаў і камсамольцаў у брыгадзе.

Пасьпяхова завяршыўшы ўборку бульбы, калгас «Бронь» узяў на буксір калгасы «Іскра», «Чырвоны партызан» і «XII Кастрычнік».

Адначасова з гэтым, па радзе калгасаў раёну ўборка бульбы праходзіць чарапашымі тэмпамі. Многія калгасы і брыгады да бульбаўборкі прыступілі са значным спазьненьнем і з першых-жа дзён не разгарнулі ўдарных тэмпаў работы.

Так, калгас «Савецкая Беларусь» да бульбаўборкі прыступіў толькі 27 верасьня, у выніку чаго плян бульбаўборкі выкананы ў зусім нязначных разьмерах. У саўгасе імя XVI партзьезду з засеянай плошчы бульбы ў 130 га ўбрана ўсяго 6 га. Уборка бульбы ў саўгасе не пастаўлена як перша чарговая баявая задача.

ВЯРБІН.

▲ **ТАЛАЧЫН.** (Наш кар.). Уборка бульбы па раёне недапушчальна затягваецца з засеяных 11.758 га, на 1 кастрычніка ўбрана толькі 2,821 га, што складае 25 проц. агульнага пляну. «Новы Быт», Славінскага сельсавету, яшчэ да ўборкі бульбы ня прыступіў. Калгас «Свабода», Аболіцкага сельсавету, бульбаўборку распачаў толькі тэтымі днямі. З боку райзя і райкалгасаюзу не наладжана апэрацыйнае кіраўніцтва і дапамога калгасам ва ўборцы бульбы. **Паўлоўскі.**

▲ **СМАЛЯВІЧЫ.** (Наш кар.). 5 кастрычніка—апошні тэрмін для скончэньня ўборкі бульбы, а між тым плян па раёне выкананы толькі на 50 проц. Ёсьць калгасы, якія выканалі плян на 16 проц., саўгасы—на 24 проц. Гэта адставаньне асабліва недапушчальна ў сувязі з тым, што частка азімых павінна быць пасеяна на бульбянішчы. **П. Кавалёў.**

▲ **МАЗЫР** Калгасы «Чырвоная зорка» і «Беларуская вёска», Даманавіцкага сельсавету, поўнасьцю закончылі ўборку бульбы

Калгасы дамагліся гэтых посьпехаў ва ўборцы бульбы дзякуючы правільнай расстаноўцы рабочай сілы і замацаваньня сталай брыгады за аднаведнымі вытворчымі вучасткамі. Брыгада, якая сеяла бульбу, праводзіла і ўборку.

Значную дапамогу гэтым калгасам аказала Даманавіцкая МТС, якая дапамагла калгасу правільна расставіць рабочую сілу і разгарнуць сацспаборніцтва паміж брыгадамі.

Калгас «Славунь» Асташкавіцкага сельсавету таксама закончыў уборку бульбы на плошчы 37 га.

Але разам з гэтым па радзе калгасаў раёну бульбаўборка праходзіць марудна. Прадзедаўскі спосаб копкі бульбы лапатай ужываецца ў большасьці калгасаў раёну, а бульбакапалкі не скарыстоўваюцца. На складзе Белсельснабу да гэтага часу ляжыць 30 бульбакапалак, якіх ні райсаюз, ні кіраўніцтва складам ня турбуюцца прасунуць у калгасы.

У калгасе «Перамога Саветаў» плян бульбаўборкі выкананы толькі на 13 проц. Брыгада, якая засявала бульбу, зараз ва ўборцы ня ўдзельнічае.

БЕЛТА.

А. Гак

Банкруцтва аграрнай „рэформы“

Прафэсар Пазнанскага ўніверсытэту, пан Ахановіч у сваёй працы аб аграрнай рэформе ў Польшчы піша: «Закон 1920 году аб рэалізацыі аграрнай рэформы ня выпрымаў жыцьцёвага выпрабаваньня. Ён аказаўся невыканальным і яго давялося зьмяніць. Ён аказаўся невыканальным у першую чаргу з прычыны празмерна вялікіх паўнамоцтваў ураду, на аснове гэтых ажыцьцяўленьне і зьмена земляробскага ўкладу ў Польшчы было амаль выключна аддадзена ў рукі дзяржаўных органаў. Нерэальным аказаўся прынцып чарговай перадачы зямлі дзяржаве, незалежна ад прыгоднасьці гэтай зямлі для мэт «асадніцтва».

Трэба згадзіцца з панам прафэсарам, сапраўды гэты закон быў няжыцьцёвы і нерэальны, але не таму, што былі «празмерна вялікія паўнамоцтвы ўраду», а таму, што буржуазна-абшарніцкі ўрад і ня думаў, яго ажыцьцяўляць, ён і ня мог яго ажыцьцявіць. Буржуазія і памешчыкі выдалі аграрны закон, выкінулі «патрыётычны» гэст у той момант, калі стаяла на парозе пралетарская рэвалюцыя, але як толькі мінула непасрэдная небясьпека, буржуазія зараз-жа пахавала гэты закон, бо ён супярэчыў яе клясавым інтарэсам.

З усёй чахарды ўрадаў, якія зьмяніліся ў Польшчы з 1919 па 1926 год, паводзін па сутнасьці ня браўся за правядзеньне аграрнага закону 1920 году. І ўсё-ж памешчыкі былі незадаволены, што ёсьць такая паперка-закон, згодна якога ўрад можа прымусова браць над парцэляцыю іх зямлю. Супроць гэтага закону памешчыкі вялі адкрытую, зацятую кампанію ў сваіх газэтах і часопісах, а таксама ў сойме і яшчэ больш за мулісамі. Банкруцтва зямельнай рэформы прымушаны былі прызнаць, нават, «прыхільнікі» сялянства: «Вызваленьне», «Пяст», ППС і інш. Зразумела, што для прысьпяшэньня гэтага банкруцтва ўсе гэтыя партыі прыклалі нямала стараньня.

III зьезд камуністычнай партыі Польшчы ў рэзалюцыі аб задачах партыі на вёсцы адзначае:

«Урачыста абяцаная ўрадам зямельная рэформа збанкрутавана поўнасьцю. Пародженая ў момант найбольшай небясьпекі для панаваньня памешчыкаў і фабрыкантаў, калі пад Варшаваю стаяла Чырвоная армія, слабутня зямельная рэформа ад 14 тэрвеня 1920 г. была ня чым іншым, як спробаю атуманіць сялян—выратаваць памешчыкаў. Замест меркаванага мільёну гэктараў памешчыцкай зямлі, якая павінна была прымусова перайсьці на працягу 5 год з рук памешчыкаў у рукі сялян,—разьмяркавана да 180.000 гэктараў дзяржаўнай зямлі паміж спэкулянтамі і кулакамі. Памешчыкі-ж прадалі згодна павялічаных дзяржаўных даных, самі і пры дапамозе сваіх аб'яднаньняў, ня больш 300.000 гэктараў (на звыш як 14 мільёнаў гэктараў памешчыцкай зямлі), таксама багатым сялянам і за высокую цану. Беззямельныя і малазямельныя зямлі не атрымалі. Можна палічыць на пальцах тыя памешчыцкія плошчы, якія згодна статуту аб зямельнай рэформе перайшлі ў распаряджэньне зямельных прабуленьняў. Паўзтовыя і валасныя зямельныя камісіі аказаліся распушчанымі. Зямельныя ўправы замест парцэляцыі (прымусовае адбраньне за плату зямлі) па мешчычай зямлі займаюцца аб'яднаньнем плошчаў-сядзяб, або «рэгуляваньнем» сервітутаў з выразнай крыўдай для сялян і карысьцю для памешчыкаў.

Цяпер, калі сытуацыя робіцца пагражаючай для панаваньня буржуазіі і памешчыкаў, калі на г. зв. крэсах расьце паўстанцкі сялянскі рух, а ў каранной Польшчы сярод сялянскіх мас пануе занедаваленьне, урад Грабскага—Тугута рыхтуе новы праект, які датычыць зямельнага пытаньня. Гутарка аб тым, каб затармазіць узрастаючую ў вёсцы рэвалюцыйную хвалю шляхам стварэньня ілюзіі, што на гэты раз урад усур'ёз імкнецца надзяліць сялян зямлёю. Гэта ёсьць новая спроба абмануць малазямельных і безьзямельных масы. Але ў сапраўднасьці мяркуемы ўрадам праект будзе стварацца прыбраць у вопратку права дзікую парцэляцыю.

Славутая «зямельная рэформа» 1920 г. не закранула памешчычай зямлі. Вызваліўшыся ў перыяд упадку валюты ад гіпотэчных даўгоў, памешчыцкая ўласнасьць, пры дапамозе дзяржаўных крэдытаў і дзякуючы адпаведнай сельска-гаспадарчай кан'юктуры, гаспадарча значна замацавалася.

Супроць зямельнага голаду, вясковага ўбозтва мабілізуецца ўся адміністрацыя, войска і паліцыя. Вядзецца спэкуляцыя ў той-жа час на багатага селяніна, кулака, паўпанка, як на апору ладу і парадку». (Рэзалюцыя III зьезду камуністычнай партыі Польшчы, выдан. Цэнтр. Камітэту КПЗБ у 1925 г.).

І сапраўды, яшчэ да майскага фашысцкага перавароту памешчыкі дамовіліся з буржуазна-кулацкімі партыямі і 23 сьнежня 1925 году сойм урачыста пахаваў закон 1920 году і прыняў новы закон аб аграрнай рэформе.

Памешчыкі рабілі міну, што яны неадаволены новым законам, але як мы ўбачым далей, гэты закон цалкам быў накіраваны на карысьць памешчыкаў і кулакоў. Вось некаторыя аснаўныя палажэньні чарговага аграрнага закону, прынятага 28-XII—25 г.:

«Устанаўляецца гадавы капітынгэнт зямлі, які падлягае парцэляцыі. Гэты капітынгэнт раўняецца 200.000 гэктараў у год. Пры чым перыяд парцэляцыі павінен працягвацца 10 год. Пры мусовай парцэляцыі падлягаюць толькі тыя маёнткі, якія не прыядуць у жыцьцё ў адпаведны тэрмін дабраахвотнай парцэляцыі. Зусім ня ўспамінаецца ні аб уплаце ўласьнікам палавіны вартасьці зямлі, не аб уплаце ім ні гатоўкаю, ні зямельнай рэнтай, ні аб утрыманьні працэнтаў з належнай сумы».

Такім чынам з усяе памешчыцкае зямлі, г. зн. з 14.500.000 га парцэляцыі падлягаюць толькі 2 мільёны га, гэ а значыць каля 1/7 часткі ўсёй зямлі, якая знаходзіцца ў руках буйных памешчыкаў, але, як мы ўбачым далей, і гэты аграрны закон толькі кавалак паперы.

Вышэй мы азнаёмілі чытача з гісторыяй аграрных законаў, сапраўднай кажучы, з гісторыяй абману буржуазна-памешчыцкім урадам парабкоў, беднакоў і сераднякоў. Абман быў разьлічаны на ачмучваньне мас, адцягненьне іх ад рэвалюцыйнай барацьбы; выкарыстоўваньне іх, як гарматнага мяса. Шырокія масы сялянства ўсёй Польшчы моцна адчулі на ўласных плечах цяжар памешчыцка-буржуазнай аграрнай рэформы, знакш кажучы, адабраньня зямлі ад сялян на карысьць памешчыкаў.

„Лішнія людзі“ на вёсцы

А на вёсцы з кожным днём усё больш расло і павялічвалася беспрацоўе, голад зрабіўся на выпадковым госьцем, а сталым жыхаром у хаце бедняка. Падаткі, дарожныя павінасьці руйнавалі бядняцка-серадняцкую гаспадарку. Бязьзямельле з кожным днём усё больш балюча біла па беднякох і серадняках. У сваёй гаспадарцы работы няма і зарабіць няма дзе.

«У сярэднім сялянская сям'я можа на працягу году аддаць сваёй гаспадарцы 71260 гадзін працы. Фактычна-ж, у карлікавай гаспадарцы сялянская сям'я аддае ёй 30129 гадзіны, а 41131 працаць». Так піша дэпутат Сталярскі ў сваім мэмарандуме, які быў прадстаўлены Земляробскаму кан прэсу ў Варшаве ў 1924 годзе. «Калі мы прымем пад увагу страту прадукцыі, якая вынікае з нянпоўнага выкарыстаньня магчымасьці бязьзямельных сялян, мы атрымаем больш-менш поўны малюнак вытворчай страты ў сельскай гаспадарцы, выклікаванай часткова дрэнным разьмяркаваньнем уласнасьці і сэрвітутамі, але галоўным чынам празьмернай густатой землеробскага насельніцтва, г. зн. перанасяленьня вёскі. Процант прыросту на сельніцтва пагаршае з году на год становішча землеробскага насельніцтва, дзеля таго, што прамысловасьць ня можа паглынуць гэты прырост».

Як бачыце, буржуазія вустамі свайго вучонага заяўляе, што адна трэць вясковага насельніцтва—лішнія людзі. Дзе-ж дзявать «лішніх людзей»? На гэтыя пытаньні паны-эксплёататары лепшым адказам лічаць дыплёматычную маўчанку. Яны сьцьвярджаюць, што горад г. зн. прамысловыя цэнтры, ня можа патлынуць усяго прыросту, бо ў прамысловасьці застой. Эміграцыя па-за межы таксама абмяжавана да крайнасьці, а таму ёсьць адзін выхад—пераправаць іх у гарматнае мяса, выкарыстаць, як зброю для захопу новых тэрыторый, новых «лішніх людзей» — нявольнікаў. Падкрэсьліваю, што «лішнія людзі» у Польшчы былі яшчэ ў 1924 годзе, тады як эканамічна-аграрна-фінансавы крызіс ня быў такі востры і глыбокі. А што-ж цяпер? Да гэтага пытаньня мы вернемся ніжэй.

Але на вёсцы беднякі і сераднякі ведаюць, што тых абшараў, якіх улядаюць памешчыкі цалкам хапіла-б каб пракармініца і самім і даць яшчэ рабочай кляче. Справа зразумела не ў лішніх людзях, а ў гніючай сыстэме капіталістычнага ладу.

Падых рэвалюцыйнага ветру з Усходу ўсё больш узьнімаў раскалыханую сялянскую масу. Лёзунг камуністычнай партыі Польшчы: «зямля сялянам без выкупу» узмацняў уплыў партыі сярод сялянскіх мас. З бяднейшага сялянства перадавыя рэвалюцыйныя элементы ўступалі ў рады падпольнай камуністычнай партыі. У працэсе клясавых баёў мацнеў і гартаваўся рэвалюцыйны саюз рабочых і сялянства, саюз супроць буржуазна-памешчыцкага ўраду і за рабоча-сялянскі ўрад. Шырокая магутная хваля рэвалюцыйных выступленьняў сялянства пракацілася як пакаранайнай і Заходняй Беларусі, дзе ў радзе месц стыхійныя выступленьні перарасталі ў партызанскі рух: Дзікая расправа карнікаў паліцыі, расстрэлы, масавыя арышты, сваволя чыноўнікаў і паліцэйскіх, катаржныя прысуды—усё пушчана ў ход, для ажыцьцяўленьня «аграрнай рэформы».

Зразумела, што як буржуазна-памешчыцкі ўрад ня можа вырашыць зямельнага пытаньня, так і дзікі тэрор ня можа спыніць рэвалюцыйнага руху, барацьбы за зямлю без выкупу. Буйныя памешчыкі на Заходняй Беларусі згодна афіцыйнай статыстыкі ўладаюць каля 40 проц. усёй зямельнай плошчы, па паасобных ваяводзтвах буйная памешчыцкая ўласнасьць разьмяркавана наступным

УДАРНІКІ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ
АДКАЗВАЮЦЬ КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ

Рабочыя друкарні імя Сталіна, заводу „Бальшавік“, фабрыкі „Кастрычнік“ новымі перамогамі, новымі гаспадарча-разьліковымі брыгадамі сустракаюць ХУ гадавіну Кастрычніка

Рабочыя „Бальшавіка“ ў барацьбе за сьцяг імя ЦК КП(б)Б

Рабочы калектыў чырвонаштандарнага заводу «Бальшавік» разгарнуў вялікую работу па падрыхтоўцы да ХУ гадавіны Кастрычніка.

Грамадзкія арганізацыі заводу адразу-ж падхапілі пастанову ЦК КП(б)Б і прэзыдыуму ЦСПСБ аб конкурсе. У дзень зьмяшчэньня пастановы ў друку, на ўсіх цэхох заводу адбыліся мітынгі, на якіх ударнікі цэхаў ўзялі на сябе абавязацельства—датэрміновага 2 дні раней вызначанага терміну) закончыць выкананьне прамфінпляну III кварталу.

Гэтыя абавязацельствы зьяўляліся ня пустымі словамі: 2-гі хромавы цэх па-бальшавіцку мабілізаваўся і выканаў прамфінплян 27 верасьня, г. зн. на тры дні раней тэрміну, прычым у колькасных паказьніках на 110,23 пр., у цэнасных—на 100,12 проц. 1-шы хромавы цэх закончыў выкананьне квартальнага пляну 28 верасьня а 1 гадзіне дню.

Работа 2-га і 1-га хромавых цэхаў увесь дзень 28 верасьня дала магчымасьць заводу ў цэлым закончыць выкананьне прамфінпляну датэрміновага на 2 дні прычым у колькасных на 110,99 проц., у цэнасных—на 100,49%, пакрыўшы прарыў жалягынняга цэху і воўнамыткі.

Завяваць права на рапарт да ХУ гадавіны Кастрычніка і сьцяг ЦК КП(б)Б пад гэтымі лёзунгамі мабілізуецца маса ўдарнікоў заводу, пад гэтым лёзунгам ідзе эмоцыянная падрыхтоўка да Кастрычніка.

Па цэхох 1 тэрыторы заводу вывешана больш 40 лёзунгаў. У 2-гім хромавым цэху вывешаны брыгадныя лёзунгі, якія канкрэтна ўказваюць кожнай брыгадзе на што павінен быць зроблен упор, дзе вузкае месца, што ад брыгады патрабуецца для лепшага выкананьня пляну.

Паміж цэхамі разгорнута сацпабарніцтва на атрыманьне заводзкага пераходнага сьцягу, паміж брыгадамі—на брыгадна-цэхавы пераходны сьцяг.

Выпушчана спэцыяльная адозва да ўсіх рабочых па падрыхтоўцы за Кастрычніцкіх сьвят.

Цэхавыя і брыгадныя штодзённікі і шматтыражкі шырока асьвятляюць ход падрыхтоўкі.

Заводская Кастрычніцкая камісія разгарнула вялікую работу—у яе ўцягнуты дэпутацкая група, агітколектыў і звыш 100 ударнікаў, якія прымаюць актыўны ўдзел у рабоце цэхавых Кастрычніцкіх камісій.

Ударны калектыў чырвонаштандарнага заводу «Бальшавік» ужо на працягу 2-х год прымае ў сваіх руках пераходны сьцяг імя ЦСПСБ. Замацоўваючы дасягнутае, яшчэ больш узмацняючы работу сярод рабочых мас, ён зможа і павінен дамагчыцца таго, каб да ХУ гадавіны Кастрычніка сьцяг імя ЦК КП(б)Б быў у яго руках.

Брыгада газ. «Сав. Бел.»:
Шамес, Мінкін.

Апэрацыйным кіраўніцтвам узмацніць падрыхтоўку да ХУ гадавіны Кастрычніка

На ліст ленінградзкіх рабочых і заводу «Бальшавік» рабочыя прадпрыемстваў г. Менску, Гомелю, Віцебску і інш. раёнаў БССР адказваюць арганізацыйным новых ударных брыгад, выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну, новымі датэрміновага пабудавальнымі сталоўкамі, кватэрамі для рабочых, гародніна-хавальнямі, арганізацыйнымі трусагадоўлі і т. д.

Калектыў чырвонаштандарнага фабрыкі «Кастрычнік» (Менск), які выканаў сваю пяцігодку ў тры гады і план першага паўгодзьдзя на 103 пр., абавязаўся датэрміновага выкананьня прамфінпляну чацьвертага заключнага году і да ХУ гадавіны Кастрычніка перавысіць план выпуску тавараў ширспажыву на 5 проц.

Калектыў рабочых ф-кі «КИМ» (Віцебск), абавязаўся да ХУ-ай гадавіны Кастрычніка зьнізіць штопку замест плянавых 30 да 20 проц., зьнізіць сабекошт на 7,5 проц. і паскорыць скончаньне пабудовы дамоў для рабочых.

Па друкарні імя Сталіна (Менск) арганізавана гаспадарча-разьліковая брыгада імя ХУ-ай гадавіны, якая за час вытворчай пераклічкі дасягнула выкананьня пляну на 140 проц. Брыгада імя Молатава выканала прамфінплян на 143 проц.

Па Палескдруку (Гомель) таксама разгорнута вялікая работа. Арганізаны 2 новыя гаспадарча-разьліковыя брыгады.

Па саюзу грамадзкага харчаваньня за час пераклічкі сацпабарніцтвам ахоплена 66 сталовых. За гэты-ж час завербавана 237 ударнікаў, арганізавана 11 новых ударных брыгад. Дзякуючы разгорнутай выхаваўчай масавай рабоце ўступіла ў члены КП(б)Б—5, у ЛКСМБ—6, прынята ў прафсаюз—126 чал. Пераведзена на гаспадарчы разьлік—54 сталоўкі, на самастойны кантакарэнт—12, на паблюдную сыстэму—11.

Але клюбы знаходзяцца па-за вытворчай пераклічкай. Яны яшчэ лічаць, што сацпабарніцтва на лепшую падрыхтоўку да ХУ-ай гадавіны клюбу і аказаньне дапамогі ФЗМК у іх рабоце—ня іхняя справа. Такой бязьдзейнасьці ў рабоце клюбных работнікаў, павінен быць пакладзены рашучы канец. Трэба ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы ролі клюбу ў вытворчай пераклічцы.

ЦСПСБ арганізуе паход на прадпрыемствы Менску з мэтай аказаньня дапамогі ў рабоце ФЗМК. Гэтыя мэтады работы павінны быць падхоплены ўсімі раёнамі БССР.

Пархоменка.

Па баявому правядзем перавыбары ячэек вынаходнікаў

(Фабрыка «Акцябр»).

У мэтах пасьпяховага правядзеньня перавыбарчай кампаніі ячэек вынаходнікаў, разгорнуваньня масавай работы па разьвіцьці вынаходніцка-рацыяналізатарскага масавага руху,—агульна-фабрычная нарада ўключаецца ў праводзімы конкурс і бярэ на сябе наступныя канкрэтныя абавязацельствы, за рэалізацыю якіх мы будзем змагацца з ўсёй бальшавіцкай настойлівасьцю

Уцягнуць ў ячэйкі вынаходнікаў ня менш як 80 проц. сяброў ІТР.

Ахапіць сяброўствам вынаходніцтва ня менш, як 25 проц. ліку рабочых на прадпрыемстве.

Дабіцца выкананьня і перавыкананьня кантрольнай лічбы на 1932 г. па рац. прапановах і вынаходках.

Да сьвята 15-ці годзьдзя Кастрычніцкае Рэвалюцыі дабіцца поўнасьцю намечанай эканоміі ад рацыяналізатарскіх прапаноў.

Прымаць актыўны ўдзел ў вытворчай пераклічцы, якая аб'яўлена ЦСПСБ.

Дабіцца поўнага ўкараненьня ў вытворчасьць ўсіх прынятых рабочых прапаноў да 15-цігодзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі, а таксама паступаючых ў час перавыбарчай кампаніі.

Поўнасьцю да 15-ці годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі выдаць прэмію аўтарам прапаноў.

Арганізаваць штодзённы збор рабочых прапаноў ў фонд 2-й пяцігодкі і па вырабе шырпажызы.

Да 15-цігодзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі поўнасьцю скончыць рэалізацію пазыкі рабочых «ідэй».

Выклікаем на лепшае правядзеньне перавыбараў ячэек вынаходнікаў, замацаваньне іх і пасьпяховае правядзеньне конкурсу *Віцебскую фабрыку «Сьцяг Індустрыялізацыі» і Менскую фабрыку імя Крупскай.*

Ліст прыняты на вытворчых нарадах.

Старшыня вытворчых нарад
ГАЛАВАЧ.

Усім ГК і РК КП(б)Б

Пералому ў разгортваньні ўсеагульнага навучаньня, у ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці няма. Неадкладна прымеце рашучыя захады да стопроцантнага ахопу вучобай няпісьменных і малапісьменных, якія падлягаюць усеагульнаму навучаньню.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ЖАБРОЎСКІ

Радыёграма

Раённым і гарадзкім саветам т-ва „Прэч няпісьменнасьць“ і аддзелам народнае асьветы

15-га кастрычніка 1932 г. у Менску склікаецца III усебеларускі зьезд т-ва «Прэч Няпісьменнасьць».

III зьезд мае вялізарнае палітычнае значэньне ў жыцьці і рабоце пяцігадзьдзя т-ва «ПН».

Зьезд зьявіцца пераломным этапам у перабудове работы т-ва «ПН» у адпаведнасьці з новымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва і культурнай рэвалюцыі.

Цэнтральны савет т-ва «ПН» і Наркамасьветы заклікаюць усе арганізацыі, кожную ячэйку і члена таварыства «ПН», усіх асьветнікаў мабілізаваць шырокую савецкую грамадзкасьць вакол пастаўленых партыяй і ўрадам задач: ажыцьцяўленьня ўсеагульнага абавязковага навучаньня малапісьменных, канчаткова завяршэньня суцэльнай пісьменнасьці, узмацненьня раённых і гарадзкіх арганізацый т-ва і яго асноўнага нізавога звяна—ячэйкі.

Дамагчыся права на рапарт зьезду перадавых фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў, сельсветаў і гарадоў, якія завяршылі і завяршаць суцэльную пісьменнасьць і пасьпяхова ажыцьцяўляюць усенавуч малапісьменных перадавых ячэек т-ва «ПН», які актыўна змагаюцца за выкананьне прамфінпляну, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за мабілізацыю сродкаў, асабліва падпіску на пазыку «4-га завяршаючага году пяцігодкі».

Раённым, гарадзкім саветам і ўсім ячэйкам «ПН» разам з арганамі народнае асьветы, пры ўдзеле прафсаюзных, камсамольскіх, грамадзкіх арганізацый, прысьвяціць да III зьезду правядзеньне шырокіх раённых, гарадзкіх канфэрэнцый-зьлётаў культармейцаў, масавых сходаў няпісьменных і малапісьменных, што праходзяць навучаньне.

Ужыць усе захады да найбольш масавага правядзеньня на працягу часу да 12 кастрычніка раённых, гарадзкіх канфэрэнцый т-ва «ПН», забясьпечыўшы выбары дэлегатаў на зьлёт з лепшых рабочых, калгасьнікаў, ударнікаў, культармейцаў, асьветнікаў.

Усю падрыхтоўчую работу і правядзеньне III усебеларускага зьезду т-ва «ПН» шырока асьвятляць у мясцовым, раённым і цэнтральным друку і праз радыё, скарыстаўшы трансляцыйныя радыё-вуалы.

Цэнтральны савет т-ва «ПН»
Народны Камісарыят Асьветы

Замест прыцягненьня да адказнасьці прызначылі ўпаўнаважаным канторы „Загатзерне“

(Ліст селькора)

Член прэзыдыуму Мікуліцкага сельсавету (Брагінскі раён) Здаравец Андрэй—сын былога царкоўнага прыслужніка, які меў сваёй сямьлі 10 га і арандаваў 15 га, рабіў незаконныя вобыскі, арышты сялян, зьяўцьцё мае масьці і прысваеньне яе сабе. Ён высяліў з кватэры сям'ю бедняка-калгасьніка Варанца Рыгора Васілёва, Брагінскі райпракурор прапанаваў усялець у кватэру Варанца, з якой ён быў высялён, але Здаравец яго не паслухаў.

Ня маючы ніякага права, Здаравец рабіў вобыскі ў калгасьнікаў-ударнікаў Шаўчука Андрэя, Галезьніка Кандрата, Музычкі Конуна. У сябе на кватэры ён трымаў сястру сваёй жонкі—кулачку Валасевіч Марылю (з вёскі Сьперыжжа), якая ўцякла ад высылкі. Ён узяў ў кулачкі—лішэнкі Варанец Ганны кабана і даў яе мужыку Варанцу Сьцяпану да куманты аб тым, што ён ня кулак і ня лішэнец.

Выяжджаўшая ў лютым—сакавіку месяцы г. г. ў Мікуліцкі сельсавет камісія, ўстанавіла усе гэтыя злачынствы з боку Здараўца. Пасьля расьледваньня гэтай справы замест прыцягненьня Здараўца да адказнасьці, яго прызначылі ўпаўнаважаным Брагінскай канторы «Заготзерне»

Калгасьнікі і ўся грамадзкасьць зьдзіўлены чаму Здаравец, які зрабіў цэлы рад агіднасьцяй, ня прыцягнуты да адказнасьці.

Селькор.

Ад рэдакцыі: «Савецкая Беларусь» просіць Брагінскую РКК-РСІ ўмяшацца ў гэту справу і аб выніках паведаміць.

„Радыё маўчыць, прамтавараў няма

(Ліст калгасьніка)

У часе веснавой сяўбы па Крупскім раёне праводзіўся конкурс па хутчэйшае і лепшае выкананьне плянаў сяўбы. Наш калгас імя *III зьезду калгасаў* (Боборскі сельсавет) скончыў сяўбу 27 мая і план выканаў на 108,9 проц. За гэта нас раённы штаб кіраўніцтва конкурсам прэміяваў радыёўстаноўкай і прамтаварамі на суму 350 руб. Пастанова штабу была надрукавана ў раённай газэце «Камуністычны Шлях» 11 тэр верня.

14-га ліпеня ў калгас прыехаў радыё-тэхнік Пірэкэцкі, за якім калгас цяць разоў пасылаў фурманку за 15 кілёмэтраў. Радыё на рацыі устаноўлі. Калгасьнікі узрадаваліся.

Але.. радыё маўчыць. «Гэта старыя лямпачкі»,—кажа радыётэхнік Пірэкэцкі. Паслалі фурманку па лямпачкі, прывезьлі новыя а радыё ўсё маўчыць. Колькі не зазьлялі, колькі не просілі адпаведныя ўстановы, ніхто не зьвяртае ўвагі на просьбы, а аптэка служыць седалам для вераб'ёў.

Прамтавараў таксама не выдалі.

Калгасьнік Пятрушын.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя лічыць, што агідны факт аб якім піша калгасьнік Пятрушын зьяўляецца вынікам палітычнай бліза рукасьці тых таварышоў, якія па вінны гэтым пытаньнем займацца. Рэдакцыя просіць РК КП(б)Б заняцца гэтым пытаньнем і аб ужытых захадах да выпраўленьня справы паведаміць.

„Хаджу цэлы год, а толку няма...“

(Ліст калгасьніка)

У 1930 годзе ў друку была зьмешчана аб'ява, у якой пісалася, што ўсе паштова-тэлеграфныя агенцтвы прымаюць мэтавыя ўклады на швэйныя машыны. Швэйную машыну ўкладчык атрымоў вае не пазьней кастрычніка месяца 1931 году.

Мной, калгасьнікам Пятрушыным Цімохам (З калгасу *III Зьезд калгасаў БССР*, Боберскага сельсавету, Крупскага раёну) 23-га верасьня 1930 году быў унесены ўклад на суму 109 руб. у Боберскае паштова-тэлеграфнае аддзяленьне на швэйную нажную машыну. Ужо прайшло два гады, а машыны я атрымаць не магу. Я зьвяртаўся ў Боберскае паштова-тэлеграфнае аддзяленьне. Адтуль мяне пасылаюць у Крупскае раённае паштова-тэлеграфнае агенцтва. А Крупскае зноў накіроўвае ў Бобер. Такім чынам я хажу цэлы год і не магу атрымаць па сваім укладзе швэйную машыну.

Я зварочваюся да газэты «Савецкая Беларусь» і прашу дапамагчы мне.

Пятрушын

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя просіць Крупскую РСІ высьветліць гэту справу і аб выніках паведаміць.

Хочаш махорку— купі чамадан

(Ліст пайніка)

Стайкаўскае сельспажтаварыства (Аршанскі раён) не прыстасавала сваю працу на пайніка так каб ён мог атрымаць тавар на сваім блізкай ад яго адлегласьці, а прыходзіцца хадзіць за атрыманьнем дробязі, як газы, сярнічак і г. д. за 10 клм. Гэта вельмі адбіваецца на рабоце рабочых саўгасаў і калгасьнікаў. Атрыманыя тавары застаюцца заўсёды ў мясцовачку Стайкава і тут-жа іх разьбіраюць, а рабочы, калгасьнік і беднякі ды сераднякі- аднаасобнікі, якія знаходзяцца ад крамы за 10 клм., ніколі і ў вочы ня бачуць гэтых тавараў.

Ёсьць шмат выпадкаў, калі ў краме Стайкаўскага сельспажтаварыства бяз прымусовага асарты мэнту немагчыма купіць якой-небудзь рэчы. Так, напрыклад, калі хто купляе махорку, дык яму або вязкова даюць чамадан, а іначай не даюць махоркі. Пры пакупцы сталовай ложкі, даюць у падарунку чайную лопаку, або іголку-шпар шатку. Усё гэта робіцца загадчыкам крамы Эльскім з дазволу старшыні сельспажтаварыства. Ворынава.

Былі неаднаразовыя выпадкі, калі старшыня сельспажтаварыства Ворынаў даваў загад не даваць у дзень адпачынку з крамы хлеба пайнікам і рабочым, пакідаючы іх бяз хлеба. Такім-жа мэтадам працуе і аддзяленьне Аршанскага леспрамгасу, якое знаходзіцца ў нашым сельсавеце.

Клушын.

Да Кастрычніцкіх сьвят ліквідуем адставаньне

Пастаноўка вынаходніцкай работы на заводзе імя Молатава да перавыбарчай кампаніі была вельмі дрэнная. Асаблівая пасьўнасьць у арганізацыі і замацаваньні цэхавых ячэек і заводзкога савету таварыства вынаходніцтва назіралася з боку заўкомупартыйнага і камсамольскага калектываў. Заводзкі друк таксама аддаваў мала ўвагі вынаходніцтву на заводзе. Такое становішча не магло не адбіцца на выкананьні БРЫзаўскіх пляна ў па ўдзеле рабочых і ІТР у вынаходніцтве.

План па БРЫЗу выкананы за 3 квартал бягучага году толькі на 50—60 проц. Вынаходніцкія ячэйкі існавалі на паперы, заводзкі савет беспрасьпна спаў.

Перавыбарчая кампанія мабілізавала ўсю грамадзкасьць заводу, перагаміла бязьдзейнасьць заўкому да гэта га важнейшага пытаньня, ад якога залежыць посьпех выкананьня вытворчых плянаў, палепшаньне якасьці прадукцыі, эфэктыўнасьць работы заводу ў цэлым і яго цэхаў у прыватнасьці.

Завод яшчэ да верасьня гг. уключыўся у правядзеньне перавыбарчай кампаніі. Па асноўных цэхах былі праведзены сходы цэхбюро і актыву, дзе ставілася пытаньне аб перавыбарчай кампаніі. З гэтага дня пачалася вярбоўка ў рады таварыства вынаходнікаў.

Па асноўных цэхах (мэханічны, зборачны), арганізаваны самаправерачныя брыгады для праверкі работы завадзкога савету БРЫЗу і аддзяленьняў рацыяналізацыі. Вынаходніцкая грамадзкасьць заводу паставіла перад сабой задачу павялічэньня сваіх радоў з 33-х чалавек да 270, арганізаваўшы 4 новых ячэйкі ў мэханічным, зборачным, лесапільным і ўтыльцэхох, уцягнуўшы ў сэкцыю ІТР 70 чалавек і дабіўшыся арганізацыі моцнай экспэрымэнтальнай брыгады для больш хуткай і пасьпяховай рэалізацыі рабочых прапаноў;

Вынаходніцкая арганізацыя заводу па баявому ўключылася ў конкурсу ЦС таварыства вынаходнікаў БССР на барацьбу за першую прэмію.

Рабочыя заводу імя Молатава абяцаюць выканаць усе ўзятыя на сябе абавязкі да XV-й гадавіны Кастрычніка і выклікаюць на сацыялістычна спаборніцтва заводы «Камунар» і імя Варашылава.

Па даручэньні пашыранага пасяджэньня Бюро рацыяналізацыі і вынаходзтва.—

Казлоўскі.

Шматтыражка „За ўдарныя тэмпы“

сёньня сьвяткуе выпуск сотага нумару газэты

(Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат)

15 месяцаў існаваньня шматтыражкі «ЗУТ» характарызуюцца яе барацьбой за ажыцьцяўленьне ленінскай устаноўкі,—што друк павінен зьяўляцца арганізатарам, агітатарам і прапагандыстам мас за баявое выкананьне задач, пастаўленых партыяй перад рабочай клясай.

Яшчэ ў чэрвені месяцы мінулага году партыйны камітэт камбіната завастрыў асаблівую ўвагу на паленшаньне работы нізавога друку на камбінаце. Выпускаемая раней ад выпадку да выпадку агульнакамбінацкая газэта «Пралетарская піла» незадавальняла ўсё ўзрастаючае запатрабаваньне 5000-ай армії рабочых дрэваапрацоўчнага камбінату.

З вялікімі перабоямі ў той час выходзілі і цэхавыя насьценгазэты, якія выпускаліся нерэгулярна і недастаткова мабілізоўвалі рабочую грамадзкасьць на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Досыць сказаць, што на 1-га чэрвеня 1931 году на камбінаце выпускалася ўсяго 10-12 насьценгазэт, якія выходзілі ня больш як адзін раз у месяц.

Абнаўленьне складу рэдакцыі, зьмена назвы газэты далі адпаведныя вынікі ў перабудове ўсёй работы нізавога друку і рабкораўскага руху на камбінаце.

Шматтыражка «ЗУТ» пачала выходзіць плянава, раней адзін раз у дэкаду, а потым адзін раз у пяцідзёнку.

Шматтыражка паставіла перад сабой задачу—максымальна ўцягнуць рабочых і рабкораўскі рух, наладзіць работу цэхавых насьценгазэт, стварыць мотны рабкораўскі актыў вакол шматтыражкі з тым, каб газэта зрасталася ма савай, здолела-б мабілізаваць рабочых на выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных задач, ускладзеных партыяй і ўрадам.

З гэтай задачай газэта справілася. На сёньнішні дзень газэта на лічвае звыш 600 рабочых—актыўных рабкораў.

З вялікімі труднасьцямі газэце давялося сустрэцца на шляху правядзеньня гэтай работы; прафарганізацыі слаба дапамагалі ў рабоце. Аднак, пры дапамозе партыйнай арганізацыі нам удалося да дню друку арганізаваць 80 штодзённых групавых, брыгадных і інтэрнатных штодзённак і 13 цэхавых насьценгазэт, якія ў сваёй штодзённай рабоце змагаюцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну на аснове поўнага ажыцьцяўленьня шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна.

Дзякуючы штодзённай мабілізацыі мас вакол газэты, мы дамаглі ся значнага палепшаньня грамадзкага харчаваньня і бытавых умоў рабочых, поўнага ўкараненьня гаспадарчага разьліку, шырокага разгортваньня сацпабарніцтва і ўдарніцтва. Газэта арганізоўвае выязныя рэдакцыі на адсталыя вучасткі, як База сыраўзіны, леспэх, Белцэх і г. д., праводзячы там канкрэтную работу па барацьбе за выкананьне прамфінпляну і асабліва экспортнай прадукцыі.

Разам з гэтым мы праводзілі вялікую работу сярод падшэфных калгасаў пасылкай пэрыядычных брыгад у калгасы, мы дамаглісь наладжваньня ў кожным калгасе рабочых троядзёнак. Мы прынялі актыўны ўдзел у правядзеньні конкурсу «Правды» па арганізацыйна-гаспадарчым ўмацаваньні калгасаў.

За апошні час мы дамаглісь значнага пералому ў справе рэатаваньня на допісы, зьмяшчаемыя ў нашай газэце. На 100 зьмяшчаемых допісаў мы атрымліваем 80-85 адказаў. Зараз перад намі стаіць задача—дамагчыся 100-процантнага рэагаваньня на лісты рабочых.

Гэтыя дасягненьні нашага газэта мае дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі камбінату, якая ў штодзённай сваёй рабоце аддавала максымум увагі справе нізавога друку.

Штодзённі ў цэхох, групах і брыгадах, у зьвязку з летнімі адпачынкамі і некаторай зьменай складу рэдкалегіі, таксама пайшлі ў «адпачынак». Праўда, зараз намі прымаюцца захады да іх ажыўленьня.

У сувязі з выхадам сотага нумару «ЗУТ», намі абвешчаны конкурс на лепшую штодзённку і лепшага рэдактара, які павінен даць рашучы пералом у палепшаньні работы нізавога друку на камбінаце.

У дзень выхаду 100-га нумару мы бярэм на сябе абавязак—зрабіць нашу газэту ўзорнай ня толькі на камбінаце, але і ва ўсім раёне.

Калектыўны карэспандэнт газэты «С. Б.» і шматтыражкі «За ўдарныя тэмпы» *С. Каган, Яновіч.*

нікаў былі таксама парцэляваны сэрвітутнае пашы і зямля, якая непасрэдна прытыкалася да гародаў вёскі Халаймоўшчыны (Сьверженьскай воласьці, Стаўпецкага павету), пры чым гэтая зямля даходзіць да самай рэчкі Заперацька. На 9 мясцовых гаспадарак (кулацкіх) вызелена 20 га зямлі; рэшту зямлі аддалі асаднікам, уся вёска пазбаўлена пашы» (там-жа, стар. 65).

І далей: «Сялянне вёскі Палкосаўе, Нелюбіцкай воласьці, Навагрудзкага павету, спрадвеку карысталіся 32 га зямлі пад назвай «Прэсьлічка», дзе мяжавалася з зямлёю, належ[illegible] фольварку [illegible] ля яўляла сабою адзіную аснову гас [illegible] дзелаў у дастатковай колькасьці. Пасьля пераходу фольварку Марысіна за [illegible]ласнасьць дзяржавы, сялянам адмовілі ў карыстаньні зямлёю. Усе хадайніцтвы жыхароў вёскі Палкосаўе адносна далейшага карыстаньня гэтымі 32 га зямлі пакінуты зямельным камісарам у Навагрудку без усялякага адказу; зямля аддадзена ў карыстаньне Пісьлікову, Дубовіку (шофэру пана Радзіволы) і Коду» (там-жа, стар. 95).

«У сялян вёскі Кадзі Галынскай воласьці, Вродзенскага павету, агульная пашча пад назовам «[illegible]» мае плошчу ў 24 дзесяціны. З гэтай сэрвітутнай зямлёй мяжуецца іх уласны зямельны надзел у 14 дзесяцін і лог—24 дзесяціны. «У 1923 годзе каморнік устанавіны. «У 1923 годзе каморнік устанавіў мяжу, адрэзаўшы ад сялян 24 дзесяціны сэрвітутнай зямлі і 14 дзесяцін іх уласнай зямлі. Адначасова прырэзаў і дзесяціны сяльскага логу за [illegible] лог» (там-жа, стар. 291).

Ваенныя асаднікі: П. Ястрэмэбскі і Замбровскі, якіх надзялілі зямлёю маёнтку Дамінікава самачынна захапілі сялянскія лугі пад назвай «Бярэзьнік», належачыя вёскі Гешгалы, Беліцкай воласьці, Лідзкага павету.

... Асаднікі прыехалі з паліцыяй у вёску Гешгалы зусім п'яныя і пачалі бегаць па вуліцы з рэвальвэрамі ў руках, пагражаючы, што будуць страляць, калі сяляне адважацца выйсьці на лог. Потым ужо ўвечары сілаю схапілі на фурманку селяніна Міхася Гаркача, завезьлі яго ў лес і зьбілі да страты прытомнасьці. Па дарозе спат калі селяніна Ўладзімера Грышкевіча, які ішоў у Ліду... адабралі ў яго мяшок з хлебам і моцна зьбілі. У гэтым жа годзе, калі сяляне пасьвілі скаціну на названым лозе, прыйшоў лясьнік-асаднік Міхалевіч і пачаў страляць з ружжа. Сяляне разброілі авангурніка» (там-жа, стар. 315).

Такіх прыкладаў можна падаць тысячы. Але мы лічым, што і паданыя даволі яскрава паказваюць, што адабраньне ад сялян зямлі на карысьць памешчыкаў і асаднікаў не адзіночны выпадак, з сыстэмы, якая адпавядае палітыцы польскай буржуазіі не жуваных тэрыторыях. Сяляне, беднякі і сераднякі, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ня толькі не атрымалі зямлі, але ад іх адабралі тую зямлю, якою яны карысталіся, як кажуць, спрадвеку.

Ня толькі зямельная рэформа, адабраньне ад беднякоў і сераднякоў зямлі, руйнуе шырокія масы працоўнага сялянства. Акупацыйная ўлада, улада фабрыкантаў і абшарнікаў, самым зьверскім чынам эксплёатуе, прыгнечвае пралетарыят і працоўныя масы горш, як за часы панщыны. У часы прыгонаў селяніну мусіў адарабляць дарма пану. Цяпер кожны паліцыянт, шпік, войт, польскі настаўнік і іх жонкі разам узятыя і кожны ў паасобку, калі-б толькі ня здумаў прыехаць, бяруць сялянскую фурманку. І, як правіла, рэдка калі плацяць ды і то па дзяржаўнай стаўцы, г. зн. 2 проты клм. гоп. Апрача таго дарожная павінасьць, гмінная павінасьць, вартыя і г. д. і г. д. Увесь гэты цяжар узвалены на плечы беднаты і серадняковаў. Памешчыкі-ж, асаднікі і куплакі, за «заслугі» ослабаняюцца ад натуральнай павінасьці. «Заслугі-ж» гэтых паноў у тым, што ўлада завяраху да нізу ў іх руках, у руках эксплёататараў.

Такі-ж малюнак мы маем і з падаткамі. Вось адзін з шматлікіх прыкладаў: «Жыхары вёскі Лабцэвічы, Хаценічыцкай воласьці, Вілейскага павету, былі абкладзены ў 1924 г. наступнымі падаткамі: 1) дзяржаўны зямельны падатак, першы ўзнос—125 злотых, 2) камунальны падатак, першы ўзнос—62 злот., 3) дзяржаўны зямельны падатак, другі ўзнос 125 злот., 4) камунальны падатак, другі ўзнос—62 злот., 5) валасны зямельны падатак, першы ўзнос—60 злот., 6) валасны зямельны падатак другі ўзнос—60 злот., 7) падатак ад хатняй жывёлы, першы ўзнос—234 злот., 8) падатак ад хатняй жывёлы, другі ўзнос—234 зл., 9) соймікавы падатак, першы ўзнос—41 зл. 50 гр., 10) соймікавы падатак, другі ўзнос—41 зл. 50 гр., 11) падатак ад будынкаў, першы ўзнос—[illegible] зл., 12) падатак ад будынкаў, другі ўзнос—129 зл., 13) падатак на мэты дарожнага будаўніцтва—78 зл., 14) страхоўка—300 зл. Усяго—1741 зл.

У вёсцы Лабцэвічы лічыцца 207 дзес зямлі, з якой 1/3 пашы аграпрацоўваецца ледзь 138 дзес. зямлі. У сярэднім на адну дзесяціну зямлі прыпадае падат ку 12,50 зл. у той час, як перад вайною, пачынаючы з 1907 году, сяляне плацілі па 50 кап. з дзесяціны, пры чым гасподарка тады была лепш пастаўлена і вёска мела на 100 проц. больш інвэнтару чым цяпер.

Гадавы бюджэт сярэдняга-заможнага селяніна, які мае 3 дзес. зямлі на 5 членаў сям'і такі: гадавы даход з 3-х дзес. зямлі роўны 45,5 пуд. зернавых хлябоў. З гэтай колькасьці неабходна адлічыць на насеньне 15 пуд. і на выплату падаткаў (30 зл.)—6 п. На пражыцьцё сям'і з 5 душ застаецца 24 пуды, што складае ў дзень на 1 душу ½ фунта хлеба». (Запросы беларускіх паслоў у польскі сойм 1922—1926 г г. стар. 292—293).

Як кажуць у такіх выпадках каментарыі непатрэбны. Гэты прыклад даволі яскрава паказвае, што падаткі руйнуюць ня толькі беднату, але і пераважную большасьць сераднякоў, што сярэдняцкая гаспадарка на Заходняй Беларусі знаходзіцца, зьбядненая, у параўнаньні з перадваенным часам, а падаткі ўзрасьлі ў 6 разоў, пры чым зусім няма заработкаў.

Калі мы дадамо пралежвацкі рабунак натуральных багацьцяў Заходняй Беларусі (зьнішчэньне лясоў і інш.), дзікі нацыянальны гнёт, ды атрымаем больш менш выразны малюнак палітыкі польскай буржуазіі на г. зв. ўсходніх крэсах.

Жахлівае становішча беднацка-серадняцкіх мас сялянства ўсёй Польшчы і асабліва ЗБ і ЗУ, пабясчаснае хранічнае беспрацоўе, рэгулярны штогодні голад штурхаюць масы на поўнае выхаду. А гэты выхад—рэвалюцыйная барацьба супроць уладу фабрыкантаў і памешчыкаў, барацьба супроць акупантаў і іх дапаможнікаў, барацьба супроць усіх эксплёататараў і іх лёкаяў. Рэвалюцыйны ўздым на вёсцы, уздым нацыянальна-вызвалення руху спрыяюць хутчэйшаму расплатаванню вёскі, хутчэйшаму вызначэньню клясавых пазыцый.

Бяднацка-серадняцкія масы сялянства Заходняй Беларусі ўсё больш рашуча ўступаюць на рэвалюцыйны шлях пад баявым сьцягі КПЗБ. Шырыцца і мацнее баявы саюз пралетарыяту і асноўных мас сялянства.

Прорва паміж кулакамі і аснаўнымі масамі сялянства з кожным днём паглыбляецца. Клясавыя супярэчнасьці абвастраюцца. Зруйнаваныя, даведзеныя да жабрацтва беднякі і сераднякі адмаўляюцца плаціць падаткі. Антыпадатковы рух ахапляе ня толькі пасобныя вёскі, але і цэлыя паветы, пачасьціўся сутычкі сялян з памешчыкамі і паліцыяй.

На зямельным голадзе, на злыбедзе, галечы мас спэкулявалі ўсе кулацкія партыі і асабліва «Вызваленьне». Іх задача—«прыслужнікаў, лёкаяў буржуазіі—адцягнуць сялянскія масы ад барацьбы за зямлю бяз выкупу, паслабіць рэвалюцыйны баявы саюз рабочых і сялян. У гэтай здрадніцкай рабоце вялікую паслугу зробілі полскім акупантам—буржуазіі і памешчыкам паны з г. зв. «Сялянскага саюзу» (Ярэміч, Рагуля), і набіўшыя руку на здрадніцтве Лушкевіч, Асфроўскі інш. Гэтыя панскія паслугачы, ап ранутыя ў авечую скуру, «абаронцаў беларускага народу» прадавалі і прадаюць гэты народ польскім акупантам. Яны,—«беларускія прадстаўнікі», дэфэнзіўныя спраў майстры, прыклад аюць нямала намаганьняў, каб зама цаваць ланцуг сацыяльнай і нацыянай няволі. Апазыцыйна-«рэвалюцыйная» балбатня гэтым куладзким пяўным панам Лушкевічам, Ярэмічам патрэбна была дзеля таго, каб уцерціся ў давер'е сялянскім масам з тым, каб на гэтым зарабіць,—больш атрымаць за сваю брудную работу.

Баявыя выступленьні сялянства на Заходняй Беларусі ў 1923-24 г. сутрэць акупантаў, моцна напалохалі буржуазію. У паасобных мясцох разрастаўся партызанскі рух, памешчыкі кідаці маёнткі і ўцякалі ў горад. Чырвоны пеўень вылізваў панскія маёнткі, сядзібы асаднікаў. Але аснаўныя недахоп у гэтай барацьбе сялянства з акупантамі быў у тым, што рэвалюцыйны рух ахапіў шырокіх бяднацка-серадняцкіх мас сялянства.

Гэтыя пэрыяды тав. Корчык у сваім артыкуле «Вузлавы пункт нашай працы ў вёсцы» («Бальшавік», орган ЦК камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, № 40) характарызуе наступным чынам:

«Вострае рэвалюцыйнае напружаньне ў заходняй-беларускай вёсцы 1923-24 г. вынікала перад усім з мясцовых спэцыфічных варунікаў, з глыбокага недавольства сялянскіх мас Зах. Беларусі акупацыйным рэжымам і насіла характар адзінгардных баёў пасьля паражэньня нямецкага і польскага пралетарыяту на фоне паслабленага тэмпу разьві

ЗА ГРАНІЦАЙ

Забарона забастовак у Германіі

Да выбараў у новы рэйхстаг застаўся адзін месяц. Характарнай асаблівасьцю выбарчай кампаніі зьяўляецца тое, што яна праходзіць пад адзнакай узрастаючага забастовачнага руху. Рабочыя масы аказваюць усё больш актыўнае супраціўленьне наступленьню прадпрыемцаў на зарплату.

За кароткі пэрыяд часу забастовачная хваля пракацілася амаль па ўсіх галінах германскай прамысловасьці, хоць ахапіла пакуль што пераважна дробныя і сярэднія прадпрыемствы. Гэта сьведчыць аб тым, што наступленьне на зарплату прыняло ўсеагульны характар і што пралетарскі адпор гэтаму наступленьню разгортваецца шырокім фронтам.

Прадпрыемцы набудавалі сваю тактыку з такім разьлікам, каб унесьці расслаеньне сярод рабочых, разьбіваючы паасобныя атрады рабочай клясы і недапускаючы іх да аб'яднаньня. Таму было пастаноўлена праводзіць зьніжэньне зарплаты не адразу ва ўсіх прадпрыемствах, а паступова, спачатку на больш дробных, а за тым на больш буйных.

Аднак-жа рабочыя зразумелі манэўр капіталістаў. Забастоўкі, якія пачаліся на дробных прадпрыемствах, утрудніл ажыцьцяўленьне генэральнага пляну наступленьня на зарплату. Абутковыя рабочыя ў Вайсэнфэльдзе, берлінскія мэбэльшчыкі, гамбурскія транспартнікі аддавалі сябе ясную справаздачу аб тым, якое вялізарнае палітычнае значэньне мае рас пачатая імі барацьба.

Посьпех гэтых авангардных баёў у значнай меры вызначае далейшае разгортваньне забастовачнага руху ва ўсёй краіне.

Выключная згуртаванасьць бастуючых рабочых і гатоўнасьць рэшты рабочых пасьледваць на першы заклік за прыкладам бастуючых прымусіла прадпрыемцаў зьмяніць тактыку. Баючыся перарастаньня барацьбы на паасобных галінах прамысловасьці ва ўсеагульную забастоўку, прадпрыемцы пастанавілі ўжыць радыкальны сродак: абапіраючыся на ўзброеную сілу, забараніць забастоўку.

У буржуазным друку ўсё часьцей сталі чуваць галасы, што ўрад Папэна павінен зрабіць далейшы крок для забясьпечаньня выкананьня наме чанай ім эканамічнай праграмы,—забараніць рабочым баставаць. Учора ўрадам апублікаваны адпаведны дэкрэт.

Урад скарыстаў надзвычайны дэкрэт мінулага году, які выдаў Брунінг, у моц якога рабочы, які незаконна адмаўляецца ад работы, траціць права на дапамогу па беспрацоўі. Праўда, у дэкрэце мелася агаворка аб тым, што рабочы мае права адмовіцца ад працы, калі на прадпрыемстве абвешчана забастоўка. Цяпер урад Папэна «растлумачыў», што зьніжэньне зарплаты, якое праводзіцца на аснове надзвычайнага дэкрэту, не зьяўляецца парушэньнем тарыфнага дагавору, а значыцца забастоўка, якая ўзьнікае ў гэтым выпадку не зьяўляецца «законнай» забастоўкай, а таму павінна быць забаронена.

Сваім новым дэкрэтам урад Папэна ня стрымае далейшага росту забастовачнага руху. Германская буржуазія паставіла сабе на мэце паступова прывучыць рабочых да голаду, аднак-жа рабочыя ўсё менш выяўляюць гатоўнасьці галадаць дзеля таго, каб аблягчыць капіталістам выхад з крызісу. Ня толькі маладыя рабочыя, але і дзесяткі тысяч старых рабочых, якія дзесяцігодзьдзямі знаходзіліся ў радох сацыял-дэмакратыі, распачынаюць пранікацца сьвядомасьцю, што адзіны выхад для іх у рэвалюцыйнай барацьбе супроць фашысцкай дыктатуры за дыктатуру пралетарыяту. Германская рабочая кляса нязвычайна вырасла і дасьць адпаведны адпор наступленьню буржуазіі.

Рабочыя масы поўны рашучасьці весьці барацьбу з прадпрыемцамі. Фашысты, якія пусьцілі ў ход рад новых дэмагагічных лёзунгаў для таго, каб пралезьці ў рады пралетарыяту, вымушаны ва многх мясцох выступаць разам з бастуючымі рабочымі.

«Тэгліхэ Рундшау» паведамляе, што на многіх прадпрыемствах можна наглядаць гэтакі малюнак: у пікетах стаяць камуністычныя і сацыял-дэмакратычныя рабочыя, а побач з імі стаяць пікеты гітлераўцаў.

Буйны капітал паставіў перад гітлераўцамі задачу: менш клапаціцца аб міністэрскіх камбінацыях, бліжэй падыйсьці да рабочых мас з мэтай утрымліваць іх ад клясавай барацьбы. Вядомы лідэр нацыянал-сацыялістаў Геббэльс дэмагагічна заклікае ў «Ангрыфе» да абароны інтарэсаў рабочых і да выкрыцьця дыктатуры ўраду Папэна, але гэтыя дэмагагічныя лёзунгі ня маюць ніякага посьпеху. Яны сьведчаць толькі аб тым, што гітлераўцы канчаткова забыталіся ў супярэчнасьцях, што пачаўся працэс іх раскладу.

Сацыял-дэмакратычныя лідары, распачаўшыя па сваёй ініцыятыве перагаворы з урадам Папэна, ужываюць усякія манэўры, каб сарваць забастовачную барацьбу. Не выступаючы адкрыта супроць лёзунгаў забастовачнай барацьбы, яны ўжываюць усе намаганьні, каб хутчэй уступіць у перагаворы з прадпрыемцамі, у часе якіх перагавораў яны цалкам капітулююць. Новы дэкрэт ураду Папэна мае на мэце разграміць супраціўленьне рабочых мас наступленьню капіталу на зарплату і тарыфныя дагаворы і зрабіць палегку сацыял-дэмакратычным лідарам і рэфармісцкім прафсаюзам правесьці іх здрадніцкую тактыку.

Толькі кампартыя—адзіны выразіцель інтарэсаў усіх працоўных Германіі—непахісна стаіць на сваім баявым посту. Выкрываючы здрадніцкую тактыку сацыял-фашыстаў яна з па удзесяніроной энэргіяй будзе змагацца за адзіны рэвалюцыйны фронт зьнізу—за далейшае разгортваньне эканамічных і палітычных баёў германскай рабочай клясы.

* * *

Бэрлін 5.-X. (Спэц. кар.). Апублікаваны ўказ агульна-германскага міністэрства працы, які забараняе забастоўкі. На прафсаюзы ўскладаецца абавязак клапаціцца аб захаваньні «міру». Прафсаюзы будуць прыцягвацца да адказнасьці, калі яны будуць кіраваць забастоўкай і аказваць бастуючым матар'яльнае падтрыманьне.

«Форвэртс» піша з прычыны новага дэкрэту, што ён зьяўляецца незаконным, аднак-жа, замест таго каб заклікаць рабочых да барацьбы, газэта апэлюе да капіталістычных судоў па справе рабочых канфліктаў.

Можна чакаць, што рэфармісты будуць цяпер з яшчэ большай энэргіяй змагацца супроць забастовак, бо яны не пажадаюць абвастрыць свае адносіны з урадам.

(«Правда»).

Забастоўка рабочых газавых заводаў у Варшаве

ВАРШАВА. 5-X. Учора а 12 гадзіне дню выбухнула забастоўка рабочых варшаўскіх газавых заводаў. Прычына забастоўкі зьяўляецца спроба магістрату зьнізіць зарплату служачым на 29 проц. і рабочым—на 15 проц.

Адразу-ж пасьля абвяшчэньня забастоўкі, паліцыя заняла ўсе памяшканьні газавых заводаў. Рэзалюцыя аб забастоўцы была прынята аднагалосна на мітынгу рабочых, які адбыўся ўчора. Прадстаўнікі варшаўскіх трамвайшчыкаў, якія прысутнічалі на мітынгу, заявілі аб сваёй гатоўнасьці падтрымаць забастоўку.

Выступленьне служачых і рабочых газавага заводу ілюструе ўзначаліць мачровыя фашысты з радоў партыі ППС, якія для сваіх здрадніцкіх мэтаў пускаюць у ход тапную «рэвалюцыйную» дэмагогію. Пашыраюцца чуткі, што сацыял-фашысцкія профбюракраты стараюцца ператварыць за бастоўку ў «аднадзённую дэманстрацыю пратэсту».

* * *

ВАРШАВА. 6-X. Неадкладна пасьля паведамленьня аб абвяшчэньні забастоўкі рабочымі варшаўскіх газавых заводаў, кіраўніцтва варшаўскага магістрату тэрмінова выклікала спэцыяльны вайсковы атрад з крэпасьці ў Модліне. Атрад, заняўшы памяшканьні газазаводаў, прыступіў да штрэйкбрэхэрскай работы.

Адначасова з гэтым, урадавы камісар Варшавы выдаў загад аб прымусовым прыцягненьні да работы майстраў і інжынэраў, якія далучыліся да забастоўкі.

Характарна, што магістрат, які перад выбухам забастоўкі ішоў на кампраміс, «ня ня заявіў аб звальненьні ўсіх бастуючых і аб адмене кампраміснай прапановы аб 15-процантным зьніжэньні зарплаты, патрабуючы 30 пр. зьніжэньня.

Адбыўся мітынг бастуючых. Моцны паліцэйскі атрад разагнаў забастоўшчыкаў, арыштаваўшы 10 рабочых. А 11 гадзіне ўвечары бастуючыя прававалі зноў наладзіць мітынг, аднак мабілізаваная паліцыя перашкодзіла правядзеньню мітынга.

Буржуазны друк вядзе шалёнае цкаваньне бастуючых, тэрарызуючы іх напамінаньнем аб новым крымінальным кодэксе, які прадугледжвае за ўдзел у забастоўцы пакараньне каталжнай турмой, тэрмінам да 5-ці год.

Амэрыканскі друк „раіць" Японіі адступіць

НЬЮ-ЁРК. 5-X. Орган гандлёва-прамысловых колаў «Джорналь оф комэрс» здавальняюча выказваецца аб дакладзе камісіі Літона. Паводле думкі газэты, урэгуляваньне манчжурскай праблемы можа быць дасягнута «шляхам згоды Японіі замяніць сваю агрэсыўную палітыку—палітыкай пры мірэньня».

Газэта «Вашынгтон-пост» заяўляе, што пазіцыя японскага вайсковага міністэрства аб тым, што яно ня будзе лічыцца з дакладам Літона, роўна значна адмове ад дагавору 9-ці дзяржаў. «Выразьненьне манчжурскага пытаньня,—піша газэта,—знясумяшчальна з адхіленьнем Манчжурыі ад Кітаю. Алзінае магчымае вырашэньне праблемы—адступленьне Японіі, асабліва з хімэрнай Манчжурскай дзяржавы. У адваротным выпадку магчымы разрыў Японіі з многімі, а магчыма і з усімі дзяржавамі. Японія ня можа ігнараваць сусьветную прамадзкую думку, якая робіць уплыў ня толькі на пытаньні вайны і міру, але таксама і на пытаньні фінансавых і гандлёвых узаемадносін».

Забарона прадвыбарчых сходаў у Германіі

БЭРЛІН. 6-X. Выконваючы аб'яўленьні ўрадавага камісара Прусіі *Брахт*, у сувязі з перавыбарамі ў рэйхстаг, выдаў распараджэньне згодна якога прадвыбарчыя сходы павінны праходзіць выключна ў закрытых памяшканьнях. Далей распараджэньне прадугледжвае забарону прадвыбарчых сходаў «усіх партый і арганізацый, пры хільнікі якіх пляванага зрываюць сходы сваіх супраціўнікаў».

«Пры вырашэньні пытаньня,—гаворыцца далей у распараджэньні,—ці ёсьць у прадвыбарчых пляхах лістоўках і брашурах доказы падбухторваньня і заклік да ваўтоўных актаў—урады павінны ўлічваць тое ўражаньне, якое выклікае даны плякат ці лістоўка на сярэдняга чытача».

Крызіс у Румыніі

ВЕНА. 6-X. Румынскі міністар фінансаў Міранэску абвясьціў аб новым зьніжэньні пэнсіі дзяржаўным служачым на 10 проц. Адначасова з гэтым у Румынскім сэнаце гэтымі днямі прынята пастанова аб тым, што выплата пэнсіі дзяржаўным служачым і дапамогі пэнсіянэрам утварацца ў залежнасьці ад становішча наяўных сум у дзяржаўнай касе. Гэтыя меры выкліканы ратоўным падзеньнем дзяржаўных даходаў у Румыніі, якія 9 бяцучым годзе зьменшыліся да 16 млрд. лей замест прадугледжаных бюджэтам 25 млрд. лей.

Для пакрыцьця неадкладных дзяржаўных расходаў, урад ужывае сродкі скрытай інфляцыі. Такім інфляцыйным мерапрыемствам у румынскіх гаспадарчых колах лічуць новы выпуск медных і срэбных манэт на 2 млрд. лей.

Міністэрствам запропанавана пры складаньні праектаў бюджэтаў на будучы год правесьці літэральна зьверскае скарачэньне. У спэцыяльным абежніку рада міністраў канстатуе, што міністэрствы перажываюць нябывалы фінансавы крызіс.

Няма грошай нават на дробныя выдаткі. Міністры працуць галовы, пяведаючы як знайсьці выхад са становішча. Грошай няма нават на закупку канцылярскіх прыладаў, на рамонт палсаванага замка і г. д. Міністар асьветы лічыць, што новае скарачэньне расходаў па яго ведамстве роўназначна скасаваньню школ.

Ня маючы сродкаў для аплаты дзяржаўным служачым і пэнсіянэрам, урад зацьвердзіў закон аб пагашэньні запазычанасьці па зарплаце і пэнсіі асобымі балкаўскімі знакамі. Біржавы курс буйных банкаўскіх знакаў не перавышае 20 проц. намінальнай вартасьці. Такім чынам румынскі скарб экспрапрыруе каля 80 проц. заработку дзяржаўных служачых і пэнсіі ім вплідаў.

Незадаволеньне сярод дзяржаўных служачых і пэнсіянэраў на гэтай глебе надзвычайна вялікае. Трэцяга дня, у адзнаку пратэсту супроць мерапрыемстваў ураду, саюзы унтэр-афіцэраў, якія знаходзяцца на пэнсіі, арганізавалі з паасобных вобласьцяй краіны галодны паход на Бухарэст. На прадмесьці сталіцы Чышла яны разьбілі свой лягер і калёнай накіраваліся ў Бухарэст, каб патрабаваць ад ураду выплаты затрыманай скарбам пэнсіі.

Яшчэ адна перамога

ПЛЯН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ III-га КВАРТАЛУ ВЫКАНАН ПА БССР НА 102,9 проц.

ЗВЫШ 30 РАЁНАЎ, КВАРТАЛЬНЫ ПЛЯН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ ПЕРАВЫКАНАЛІ (ЗАСЛАЎСКІ, ЖЫТКАВІЦКІ, МЕНСКІ, МСЬЦІСЛАЎСКІ І ТУРАЎСКІ І ІНШЫЯ РАЁНЫ).

ХРОНІКА

▲ Рабочы мэханік дрэваапрацоўчага заводу імя Молатава тав. Малкаў вынайшоў цыліндрычную печ для абаграваньня вялікіх будынкаў, кватэр і розных памяшканьняў. Вынайдзеная печ прыстасавана выключна для скарыстаньня ў якасьці апалу драўляных адкідаў і плавіньня і дае цяплыню на працягу 20 гадзін безупынна.

Такая печ ужо пастаўлена у сталоўцы заводу імя Молатава.

* * *

▲ Зборнік аб белым тэроры ў Польшчы і ў Заходняй Беларусі рыхтуе Беларуская Акадэмія Навук да X-годзьдзя МОПР'у СССР.

* * *

▲ Дзіцячы кіно-тэатр адкрываецца ў Менску ў памяшканьні былой крэпі ў дні сьвяткаваньня XV гадавіны Кастрычніка.

* * *

▲ 20 вагонаў выпускае з рамонту Полацкае чыгуначнае дэпо ў падарунак да XV гадавіны Кастрычніка. Рамонт вытвараецца ў выходныя дні.

* * *

▲ У зьвязку з XV гадавінай Кастрычніка аддзел рацыяналізацыі і БРЫЗ Менскай абутковай фабрыкі выпускаюць другую пазыку рабочых ідэй. У гэтай пазыцы прымаюць удзел інжынэрна-тэхнічныя работнікі і рабочыя фабрыкі.

За кожную ўнесеную і прынятую да рэалізацыі прапанову або вынаходзтва выплачваецца грашовая прэмія ў разьмеры ад 25 руб. да 50 тыс. руб. у залежнасьці ад яе каштоўнасьці і той эканоміі, якую яна дае за год.

Пазыка ідзе пад лёзунгам унясьненьня ў фонд XV-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі свае прапановы па барацьбе са стратамі на вытворчасьці, у цэху, брыгадзе і па сваім працэсе.

* * *

Акадэмікі, навуковыя і тэхнічныя работнікі і аспіранты БАН пастанавілі ўключыцца ва ўсебеларускую вытворчую пераклічку. БАН абавязалася пераклічку ператварыць у масавую кампанію, мабілізуючы навуковых работнікаў на выкананьне вытворчых плянаў Акадэміі, зрабіўшы ня сродкам папулярызацыі навуковых дасягненьняў СССР і БССР за 15 год.

БАН выклікала Усесаюзную і Украінскую Акадэміі Навук на сацыялістычнае спаборніцтва, па лепшым правядзеньні пераклічкі і ўзяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў:

Да Кастрычніцкай гадавіны выканаць вытворчы плян Акадэміі за 10 месяцаў. Арганізаваць прамадзкі бюро сір пераладзьях інстытутаў для дапамогі найбольш адстаючым і праверыць фактычнае становішча сацспаборніцтва і ўдарництва, увязаўшы гэта з праверкай ступені выкананьня дагавору па сацспаборніцтве, заключаным паміж БАН і УсеАН і УАН. Высунуць на адказную работу таварышоў, якія добра правялі сябе на рабоце, з прадстаўленьнем навуковых камандыровак ім для ўзьвышэньня кваліфікацыі. Арганізаваць збор прапаноў па палепшаньні работы БАН. Паслаць брыгаду ў падшэфныя калгасы для мабілізацыі мас у справе выкананьня загатовак збожжа, рэалізацыі пазыкі «4-ты зьвяршаючы год пятігодкі» і г. д. Дапамагчы калгасам у разьмерках зьніжэньня прыбыткаў і наладжваньні рацыяналізатарства. Арганізаваць збор сродкаў для палітзьняволеных. Выпусьціць спэцыяльны зборнік «Навука ў БССР за 15 год».

Японія рыхтуе матар'ялы аб „каранных зьменах" у Манчжуры!

ТОКІЁ. 6-X. Паводле паведамленьня агэнцтва *«Сімбун-Рэнго»*, камісія японскага міністэрства замежных спраў па распрацоўцы адказу на даклад камісіі Літона 5-га верасьня пастанавіла прадставіць матар'ялы аб каранной зьмене становішча ў Манчжурыі пасьля складаньня дакладу Літона. Камісія лічыць неабходным увесьці ў Лігу нацый прапанову аб вырашэньні манчжурскага пытаньня на аснове новых даных.

Працэс рабочых-камуністаў

ВАРШАВА. 6-X. Закончыўся працэс 19-ці рабочых, якія абвінавачваліся ў «арганізацыі камуністычных ячэек», сярод салдат у м-ку *Ромэртове* (Варшаўскае ваяводзтва) і сярод вайсковых часьцей Варшаўскага гарнізону. Працэс працягваўся 10 дзён. Падсудныя засуджаны да розных тэрмінаў зьняволеньня і катаржнай турмы (ад 2-х да 6-ці год).

ЭНЭРГІЧНА ЗМАГАЦЦА ЗА ПРАВА

СТАЦЬ НА СТАРТ ТРЭЦЯГА КОНКУРСУ

Жлобінскі раён—перадавы па адгрузцы бульбы і плодагародніны

Работа транспарту па адгрузцы бульбы і плодагародніны за 4, 5 і 6 кастрычніка характарызуецца некаторым нарастаньнем тэмпаў. Калі ў першыя дні кастрычніка адгрузкачныя пляны вытрымліваліся толькі Жлобінскі і Гомельскі раёны, дык за 6 кастрычніка вытрымліваюць сваю работу і Віцебскі раён. Лепш за ўсіх, бяз усякіх перабояў, працуе Жлобінскі раён, якім пагрузачныя пляны выконваюцца штодзённа. Мы ўжо і за раз ставім пытаньне аб прэміраваньні Жлобінскага раёну, а перад арганізацыямі раёну—задачу ня толькі большага ўзмацненьня і чоткай работы па адгрузцы.

Работа транспарту характарызуецца наступнымі паказьнікамі.

4 кастрычніка.

Жлобінскі раён адгрузіў 77 вагонаў, з якіх бульбы—64. Пляны на адгрузку выкананы цалкам.

Па-ранейшаму адстае *Унеча*, дзе адгружана 20 вагонаў. Гэта складае каля 50 проц. дзённага заданьня, бо 25 вагонаў на станцыях раёну не загружаны і тлумачыцца непадачай паражняку, у чым вінавата Ворша і Магілеў. Магілеў сыстэматычна недадае вагонаў на вучастак Магілеў—Крычаў.

Гомель адгрузіў 19 вагонаў бульбы і 8—плодагародніны. Па віне чыгункі не адгружана 2 вагоны бульбы.

Аршанскі раён загрузіў 54 вагоны. 2 вагоны не загружана па віне чыгункі і 5 вагонаў па віне адправіцеляў. На станцыю *Ворша, Смалявічы і Дзяржынск* клієнтурай не падвезены грузы.

35 вагонаў адгрузіў *Віцебскі раён*. На *ст. Гараны* сарвана пагрузка 1 вагона бульбы з прычыны адсутнасьці грузу. 4-га кастрычніка Віцебскі раён меў магчымасьць выйсьці пераможцам, але перашкодзіла ст. Гараны, якая недагрузіла 1 вагон. На гэтую станцыю, якая сыстэматычна тармозіць работу раёну, кіраўніцтву трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

5 кастрычніка.

Аршанскі раён адгрузіў 40 вагонаў. 5 вагонаў бульбы недагружана па віне канторы плодагародніны, якая не даставіла грузаў на *ст. Асінаўка, Ворша, Лепель і Чашнікі.*

Унецкі раён вагонамі быў забясьпечан цалкам. Адгружана 36 вагонаў. Сарвана пагрузка 7 вагонаў па віне адправіцеляў, якія не даставілі грузаў на ст. *Камунары і Тлес.*

Плян на адгрузку 70 вагонаў плодагародніны і бульбы *Жлобінскі раён выканаў. Больш за ўсіх адправіла ст. Слуцак, якая за гэты дзень адгрузіла 15 вагонаў.*

Здаў тэмпы *Гомельскі раён.* Ён адгрузіў 21 вагон. Недагрузка складае каля 30 проц. Па віне чыгункі не паданы паражняк на ст. *Гародня, Нахаў, Аўрамаўская і Васілевічы.*

Віцебскі раён адгрузіў 65 вагонаў. *На ст. Гараны недагружана 5 вагонай бульбы.*

6 кастрычніка.

Перавозачныя пляны выкананы *Гомельскім і Жлобінскім раёнамі.* Першы адгрузіў 39 вагонаў, другі —68.

Выкананы перавозачны плян таксама і Віцебскім раёнам, які адгрузіў 52 вагоны і з іх 40 бульбы.

Аршанскі раён адгрузіў 68 вагонаў. Не завезена бульба на ст. *Лепіна і Ворша,* на якіх сарвана пагрузка 4 вагонаў.

Унецкаму раёну патрэбна было адгрузіць 17 вагонаў. Пад пагрузку падана 15 вагонаў, але і з іх загружана толькі 13. Як зідачы апрачі чыгунні, па Унецкім раёне па-агіднаму працуе і клієнтура.

* * *

Недагрузка першых дзён кастрычніка павінна быць пакрыта ў бліжэйшыя дні. Да гэтага патрэбна, у першую чаргу, узмацніць завоз грузаў на станцыі і забясьпечыць пагрузку патрэбнай колькасьці вагонаў.

Зьмяшчаючы аператыўныя матар'ялы аб пагрузцы, мы настойваем перад усімі арганізацыямі раёнаў, райКК-РСІ, транспартнай пракуратурай і інш. аб неадкладным рэагаваньні на прычыны, што перашкаджаюць бесьперабойнаму прасоўваньню грузаў.

Паравозьнікі ўключыліся ў сацспаборніцтва

(Наш карэспандэнт)

1-га лістапада будзе дан старт II усесаюзнага конкурсу спараных брыгад, які будзе праходзіць пры назьнасьці каштоўнага вопыту першых двух конкурсаў. Як і першыя два, гэты конкурс ня мысьліцца без актыўнага ўдзелу ў ім усёй масы чыгуначнікаў.

Зараз ідзе месячнік падрыхтоўкі і адборкі лепшых, якія адзмагаюць гонар стаць на старце ўсесаюзнага конкурсу. Паравозьнікі Жлобінскага раёну з энтузіязмам вітаюць конкурс, абавязваюцца з гонарам правесьці яго. 14 паравозаў Асіпавіцкага дэпо рапартавалі аб сваёй гатоўнасьці да конкурсу, да асеньня-зімовых перавозак. Пераклічка разгортваецца, ахапляе паравозы іншых дэпо раёну.

Паравозьнікі дэпо Жлобін прад'явілі рахунак гаспадарнікам—не выпускаць ніводнага паравоза з невыкананым рамонтам па запісах машыністаў; складу апалу—ніводнага паравоза не затрымліваць пад наборам апалу больш гадзіны; дыспэтчарам—сваячасова прасоўваць паравозы, не затрымліваць іх у абаротных дэпо.

ІТР усіх дэпо ўзялі шэфства над паравозамі, у Асіпавіцкім—яны арганізоўваюць паездкі на падшэфных паравозах для выяўленьня іх сапраўднага становішча. Асіпавіцкае дэпо па ўсіх аб'ектах вядзе спаборніцтва з дэпо Магілеў.

Арганізоўваецца раённы конкурс, у якім бяруць удзел, апрача цяг, аддзелы эксплёатацыі, шляху, сувязі. Вызначаны прэміі для лепшых машыністаў раённага спаборніцтва.

Але побач з гэтым ёсьць яшчэ і недаладкі, якія ўжо ў першай палове адборачнага спаборніцтва вельмі адчувальны. У дэпо Жлобін усю ўвагу зьвярнулі толькі на мабілізацыю паравозьнікаў, а сярод іншых кваліфікацыйная работа вядзецца недастаткова. Не замацаваны яшчэ дэпойскае журы. Не замацавана журы і ў Асіпавічах, тут прамарудзілі з арганізацыяй унутрыдэпойскага конкурсу. У Магілеве не правялі належнай работы на складзе апалу, які фактычна не бярэ ўдзелу ў адборачным спаборніцтве. І на дзіва, што замест 0,5 сотых гадзіны паравозы пад наборам апалу прастойваюць тут у сярэднім па тры гадзіны, а то і па 5.

Калі ў Жлобіне і Асіпавічах сур'ёзна адносяцца да ўдару выкананьня ўмоў спаборніцтва, выдумкі вучыцкаў і выніхі апрацоўваюцца слаўсова, дык у дэпо Магілеў з апрацоўкай вынікаў пазнацца і наўна думаць гэта тым, што няма рахункаводда.

Клюбы, якія павінны былі-б разгарнуць шырокую масавую работу вакол конкурса, абсалютна яшчэ нічога не зрабілі. Нічым пакуль што не праявілі сябе Жлобінскае і Магілёўскае ТСТ. Яны забыліся на ўдарнае забясьпечаньне ўдзельніку конкурсу.

Першая палова падрыхтоўчага перыяду паказала, што ўдарны працуюць асіпавіцкія паравозьнікі. Тут 18 паравозаў маюць плюсавыя балы, у сярэднім па 198, і толькі 3 паравозы маюць балы на мінус. Значна горш працавалі жлобінскія паравозьнікі. Тут толькі 10 паравозаў маюць плюсавыя балы—па 160 у сярэднім, а 13 паравозаў маюць балы на мінус. І калі на адзін паравоз Асіпавіцкага дэпо ў сярэднім прыпадае 180 балаў, дык у Жлобінскім—усяго толькі 12. Да гэтага-ж трэба дадаць, што ў Жлобінскім дэпо ёсьць паасобныя паравозы, якія маюць каля 20 проц. перапраўу.

Напярэдадні яшчэ амаль месяц работы па адборачным спаборніцтве. Гэты месяц павінен у самым пачатку адзначыцца рэзкім пералёмам у рабоце. Трэба дэталёва прааналізаваць і вывучыць памылкі першых двух конкурсаў, улічыць вопыт і станоўчыя боку работы па іх, каб хутчэй перабудзіцца. Кастрычнік павінен быць месяцам перамог, месяцам адзарыўленьня паравознай гаспадаркі і падрыхтоўкі паравозьнікаў да сьвята Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Тапыс.

На адкым паравозе па 10 гаспадароў

ВОРША. (Белта). За апошні час на Аршанскім вузьле значна паслабла масава - растлумачальная работа сярод паравозных брыгад, у выніку чаго павялічыліся выпадкі зрыву спаранай язды.

За дзьве дэкады верасьня на паравозе Щ—28 езьдзіла 7 машыністаў, 5 памочнікаў і 3 кацтагары, на паравозе 0—66911 езьдзіла 7 машыністаў і 9 памочнікаў і г. д. Павялічыліся выпадкі зрыву спаранай крыюцца ў адсутнасьці чоткай работы нарадчыкаў, у неўстаноўцы тэлефоннай сувязі з брыгадамі, частай зьмены падменных брыгад, непрыстасаваньня апарату дэпо да часу руху цягнікоў.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня

Ад 6 кастрычніка Новы гукавы гаварашчы фільм ПЯТНАЦЦАТЫ

Сэктар кадраў НКФ БССР абвяшчае набор асьпірантаў пры Беларускім ФЭІ па наступных спэцыяльнасьцях:

1) Фінансы СССР і капіталістычных краін.
2) Крэдыт і грошы СССР і капіталістычных краін.
3) Эканоміка і фінансаваньне сац. прамысловасьці.
4) Сацыялістычны вучот.

У асьпіранты прымаюцца асобы, якія скончылі фінансавы інстытут і аддзяленьні, а таксама асобы, маючыя закончаную вышэйшую эканамічную адукацыю ва ўзросьце ад 20 да 35 год.

Пры падачы заяў неабходна дадаць:

1) Засьведчаньня: а) уласны жыцьцёпіс і б) анкету асьпіранта;
2) Водзывы партыйных, прафсайных і грамадзкіх арганізацый;
3) Даведкі: а) аб сацыяльным паходжаньні, в) аб ставе здароўя;
4) Пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал).

Асьпіранты забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 225 р. у месяц і кватэрным грашыма. Кватэр інстытут не дае.

Заявы і дакументы прымаюцца штодзённа да 1-га лістапада 1932 г. канцылярыяй Інстытуту—Менск, Савецкая вул. Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой № 203

СЭКТАР КАДРАЎ НКФ БССР

Чэрвеньскі сьвінагадоўчы тэхнікум працягвае набор студэнтаў на 1-шы курс да 1 лістапада 1932 г. і адначасова ўтварае набор курсантаў на падрыхтоўчае аддзяленьне для падрыхтоўкі ў тэхнікум

Студэнты і курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам згодна існуючага палажэньня.

Заявы з адпаведнымі дакумантамі пасылаць да 25 кастрычніка 1932 г. па адрасе: Чачэрск, Чачэрскага раёну, Сьвінагадоўчаму тэхнікуму.

Аб залічэньні і патрэбе зьявіцца на заняткі будзе паведамлена

Дырэктар тэхнікуму СУКОНЬНІКАЎ.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ—СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

Менскі філіял.—гор. Менск, Ленінская, 15.

Тэл. № 95 к-к рах. у Менскім аддзяленьні Дзяржбанку № 150—21—40-а

КНІГА-ПОШТАЮ

З мэтаю набліжэньня беларускай і нац. кнігі непасрэдна да спажыўца і каб даць магчымасьць кожнаму хутка атрымаць літаратуру, незалежна ад месца яго работы і пражываньня пр. Цэнтральным кніжным магазыне Менскага філіялу ДБВ арганізаваны аддзел

КНІГА-ПОШТАЮ

КНІГА-ПОШТАЮ—высылае па першым патрабаваньні любую кнігу выданьня ДВБ і іншых выдавецтваў, якая толькі ёсьць на кніжным рынку.

КНІГА-ПОШТАЮ—высылае літаратуру на мовах: беларускай, рускай, яўрэйскай, польскай, літоўскай і латыскай.

КНІГА-ПОШТАЮ—камплектуе масавыя і іншыя бібліятэкі розных тыпаў для рабочых клюбаў, дамоў сацкультуры хат-чытальняў, школ і г. д.

Кнігі высылаюцца паштовымі пакункамі па атрыманьні задатку прыблізна 25 проц. ад сумы заказу накладной платай на астатнюю суму

КНІГА-ПОШТАЮ—выконвае заказы на літаратуру па розных пытаньнях і на розныя тэмы (партмас, сельгас, вучэбную, проф., ваенную, камсамольскую, піонэрскую, школьную, дзіцячую і г. д.).

КНІГА-ПОШТАЮ—дае кніжную кансультацыю і даведкі вусныя і пісьмовыя) па беларускай і нацыянальнай кнізе.

КНІГА-ПОШТАЮ—прымае заказы і адказвае на запытаньні індывідуальных (асобных) спажыўцоў, арганізацый і калектываў.

КНІГА-ПОШТАЮ— выконвае заказы і адказвае на запытаньні хутка і акуратна.

Пры атрыманьні ўсёй сумы заказу ўперад—перасылка даромна.

Заказы і грошы шлеце на адрасу: гор. Менск, Цэнтр. магазын Менскага філіялу Дзяржвыдбелу—Ленінская 15

Аддзел „КНІГА-ПОШТАЮ"

Даводзіцца да ведама, што з аб'яднаньня хімічнай прамысловасьці пры НКЛ Праму БССР «Белхімпрам» вылучана хімічная група, якая адайшла да Упраўнавожанага НКТажпраму СССР пры СНК БССР. Да гэтай групы адайшло будаўніцтва ацэтонав га заводу ў Быхаве і пяцігодка па цяжкай хіміі.

Пад кіраўніцтвам Белхімпраму засталіся наступныя прадпрыемствы:

1. Завод хімічнай крэйды і тэрмаізаляцыі „Чырвоны хімік" Нова-Беліца.
2. Завод сухіх фарбаў «Краскоцвет» – Лоеў.
3. Лакапалітурны завод—ст. Дземіх, Рэчыцкага раёну.
4. Завод плаўленай крэйды – Крычаў.
5. Фабрыка галаліта-цэлулёйдных вырабаў «Беларуска» Менск
6. Будаўніцтва косьцеапрацоўчага заводу—Магілёў.
7. Пяцігодка хімічна-тлушчавай і парфюмэрнай прамысловасьці пры НКЛП БССР.

Аб'яднаньне хімічнай прамысловасьці пры НКЛП БССР „Белхімпрам" ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ в Савецкай вул. № 82 на пляц Волі № 21-1, будынак Наркамлёгпраму БССР, 2-гі паверх, пакой № 16-17, тэлефон № 452.

БЕЛХІМПРАМ

Грамадзянін в. Капцевічы, які паходзіць з сяла Мялешка Мікалай, мае сваё прозьвішча Мялешка ня прозьвішча Стэмпкоўскі.

Асобы, якія маюць претэнзіі спрошць зьмены прозьвішча, павінны паведаміць аб гэтым Жыткавіцкі ЗАГС, паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства.

ЗГУБЛЕНЫ

Парт. білет выд. Менгаркомам за № 1101165 Берштэйн Ш. Л. кв. 2041.

Камсамольскі білет в. Магілёўскі раёном Круглік С. І. кв. 2042.

Пашпарт Рыгінскага сельсавету Сьбко Б. О. 2043.

Пенс. кніжка выд. Менгатозамкам Сенько І. О. кв. 2044.

Пашпарт выд. Ратамскім сельсаветам Шкуцкая А. В. кв. 2045.

Мандат члена Менгарсавета Шуляк М. Б. кв. 2047.

Друкарня імя Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбіту № А-84